Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 278 (5952) | 4 снежня 1937 г., субота | ЦАНА 10 КАП.

Праз восем дзён працоўныя нашай краіны пойдуць да выбарчых урнаў галасаваць за лепшых сыноў народа, за палкіх патрыётаў соцыялістычнай радзімы, партыйных і непартыйных большэвікоў.

У дні сталінскай дэкады стаханаўскіх рэкордаў новымі вытворчымі перамогамі адзначым набліжэнне гістарычнага дня выбараў у Вярхоўны Совет СССР!

ДА НОВЫХ ВЫШЫНЬ ПРАДУКЦЫЙНАСЦІ ПРАЦЫ

Сёння чацвёрты дзень сталінскай дэкады стаханаўскіх рэкордаў. Ініцыятыва стаханаўцаў Сталінскага раёна гор. Масквы, якія рашылі адзначыць радасныя перадвыбарчыя дні новымі вытворчымі поспехамі ў гонар вялікага Сталіна і прапанавалі правесці сталінскую дэкаду стаханаўскіх рэкордаў, аднадушна падтрымана ўсёй нашай краінай.

З новай сілай разгортваецца паўсюдна соцыялістычнае спаборніцтва на паспяховае завяршэнне плана бягучага года і большэвіцкую падрыхтоўку да ажыццяўлення плана 1938 года, першага года трэцяй сталінскай пяцігодкі.

Працоўныя БССР, як і ўсяго Совецкага Саюза, гарэць жаданнем сустрэць знамянальны дзень выбараў у Вярхоўны Совет СССР — 12 снежня — не толькі аднадушным галасаваннем за лепшых людзей нашай партыі і народу, але і новымі вытворчымі перамогамі. Гэтае благароднае імкненне мас — як мага лепш адзначыць гістарычны дзень выбараў у вышэйшы орган улады — вынікае з тых соцыялістычных адносін да працы, у духу якіх масы выхаваны нашай партыяй.

Выбары ў Вярхоўны Совет СССР будуць праходзіць па новай Сталінскай Канстытуцыі, найдэмакратычнейшай Канстытуцыі ў свеце. Сталінская Канстытуцыя, гадзіна з дня зацвярджэння якой Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездам Советаў заўтра спаўняецца, з'яўляецца для кожнага грамадзяніна нашай краіны самым блізкім і дарагім дакументам, які запэўнівае і раласнае жыццё.

Вось ужо год, як над нашай радзімай развяваецца пераможны сцяг Сталінскай Канстытуцыі, якая ўсімі пунктамі гаворыць, што совецкае грамадства ўжо ажыццявіла соцыялізм, стварыла соцыялістычны лад. Зазаёўаныя і ажыццёўленыя прынцыпы соцыялізма складаюць аснову Сталінскай Канстытуцыі. Яна не толькі абвяшчае правы грамадзян на працу, на адпачынак, на асвету, але і гарантуе ўсе гэтыя і ім падобныя правы, забяспечвае іх у законадаўчым парадку матэрыяльнымі сродкамі. Канстытуцыя СССР не толькі абвяшчае роўнасць усіх грамадзян, але і гарантуе гэтую роўнасць без усякіх агаворак.

З усіх куткоў Совецкай Беларусі прыходзяць весткі аб новым узлыме соцыялістычнага спаборніцтва і стаханаўскага руху. Стаханавец віцебскага металазавода імя Кірава тав. Лін у першы дзень сталінскай дэкады стаханаўскіх рэкордаў дасягнуў найвышэйшай выпрацоўкі па заводу — 604 проц. нормы. Стаханаўка таго-ж завода тав. Геніна на другі дзень выканала сваю норму на 450 проц. Стаханавец віцебскага паравознага дэпо казаль Раманаў даў 601 проц. нормы. Стаханаўцы бабруйскага металазавода імя Сталіна Пархімовіч і Попель выканалі свае нормы на 750 проц. кожны.

Небывала высокі палітычны і вытворчы ўздым наглядаецца на прадпрыемствах Менска. Натхнёныя высокім гонарам, аказаным Кліментам Ефрэмавічам Варашылавым, даўшым згоду балатыравацца па Менскай гарадской выбарчай акрузе дэпутатам у Вярхоўны Совет СССР, працоўныя Менска рыхтуюцца апраўдаць гэты гонар і давер'е не толькі пагалоўнай яўкай і ўдзелам у галасаванні, але і новымі вытворчымі перамогамі.

Стаханавец дрэваапрацоўчага завода імя Молатава тав. Нодэльман прысвяціў свой першы рэкорд таварышу Варашылаву. Ён выканаў норму ў першы дзень сталінскай дэкады стаханаўскіх рэкордаў на 502 проц. Малады рабочы завода імя Мяснікова тав. Шастакоў даў 389 проц. нормы, поўнасцю ліквідаваўшы пры гэтым брак. Стаханавец штамповачнага цэха завода ланцугоў Галя тав. Шабан выканаў норму на 340 проц. Прыкладаў высокай прадукцыйнасці працы на прадпрыемствах, у калгасах і соўгасах можна прывесці многа. Не толькі рэкорды асобных стаханаўцаў знамянуюць масавы вытворчы ўздым. Цэлыя прадпрыемствы, цэхі, змены, калгасы і соўгасы за апошнія дні паляпшаюць свае паказальнікі.

Вялікае значэнне для забеспячэння сапраўды большэвіцкага поспеху сталінскай дэкады стаханаўскіх рэкордаў маюць пытанні арганізацыі спаборніцтва. Ні на хвіліну нельга дапусціць самацёку ў гэтай важнейшай справе. Між тым, як раз з арганізацыяй спаборніцтва не ўсюды абстаіць добра. Трэба сказаць, што наркаматы да гэтага часу не ўзначаліді велізарнага вытворчага ўздыму на прадпрыемствах. Намеснік наркома мясцовай прамысловасці тав. Галуза, напрыклад, не ведае нават, як праходзіць сталінская дэкада стаханаўскіх рэкордаў на заводах. Яго ўдзел у «кіраўніцтве» спаборніцтвам заключаецца ў тым, што ён... чакае чарговай зводкі работы прамысловасці за пяцідзённку. Ці трэба шукаць больш бюракратычнага метаду кіраўніцтва соцыялістычным спаборніцтвам?

Такой-жа хваробай, як у Наркаммяспроме, хварэюць і ў астатніх наркаматах, а таксама некаторыя кіраўнікі прадпрыемстваў. На заводзе імя Варашылава, напрыклад, у рэзультаце дрэннай падрыхтоўкі да дэкады, з першых-жа дзён выявіўся недахват інструментаў, матэрыялаў, няспраўнасць станкоў. Гэта выклікала прастоі рабочых і, натуральна, паніжэнне прадукцыйнасці. На Гомельскім дрэваапрацоўчым камбінаце ў першы-ж дзень дэкады мэблевая фабрыка не выканала свайго плана. Аказалася, што кіраўніцтва фабрыкі (дырэктар т. Карпман) не паклапацілася аб аглядзе абсталявання і забеспячэння патрэбнымі матэрыяламі. У рэзультаце — свідравальны станок ўвесь дзень не працаваў, з перабоямі працавала машыннае адзяленне цэха шырспажыву. Зрывала работу і адсутнасць лакаў. Такіх прыкладаў, нажаль, яшчэ не мала. Наяўнасць гэтых фактаў сведчыць пра тое, што сям-там яшчэ працуюць па-старому, не перабудоўваюць металаў кіраўніцтва так, як гэтага патрабуюць партыя і ўрад.

Узор перабудовы, які павінны пераняць усе галіны прамысловасці, паказвае цяжкая індустрыя, узначальваемая Лазарам Майсеевічам Кагановічам. Тут работа пачалася з навядзення парадку на вытворчасці, барацьбой за чоткую працу па графіку, за ліквідацыю прастояў і аварый, за пашырэнне скарыстання вопыту перадавых.

Стаханаўцы працуюць даступнымі для ўсіх металамі. Кожны, хто сумленна адносіцца да справы, можа прапавацца па-стаханаўску. Такім трэба ў гэтым дапамагчы. У цэху, на ўчастку вытворчы працэс павінен быць арганізаваны так, каб усе, без выключэння, рабочыя маглі даваць высокую прадукцыйнасць. Гэта ў поўнай меры магчыма. Патрабуецца толькі, каб на вытворчасці быў большэвіцкі парадак. Справа гонару кожнага гаспадарніка, інжынера і тэхніка гэты парадак забяспечыць.

Дэныя аб ходзе сельскагаспадарчых работ у рэспубліцы сведчаць пра тое, што ў раёне раёнаў (Слуцк, Менск і інш.) работа арганізавана дрэнна, чым затрымліваецца размеркаванне ўраджаю па прадпрыемствах. Справа гонару раённых партыйных і совецкіх органаў, кіраўнікоў калгасаў і соўгасаў — на імя выбараў у Вярхоўны Совет СССР поўнасцю закончыць абмалот ураджаю і размеркаванне яго па прадпрыемствах.

Сталінскую дэкаду стаханаўскіх рэкордаў нельга разглядаць, як вытворчы штурм. Нельга дапусціць, каб за ўздымам, які дасягнуты зараз, наступіла павольнасць тэмпаў пасля сканчэння дэкады. Наадварот — дэкада пазінна зрабіць пачатак безупыннага росту прадукцыйнасці працы.

Узначаліць вытворчы ўздым мас, з поспехам правесці сталінскую дэкаду стаханаўскіх рэкордаў — азначае перш за ўсё шырока распаўсюдзіць стаханаўскі вопыт, бязлітасна змятаць усе перашкоды, што стаяць на шляху стаханаўскага руху. Задача гаспадарнікаў, інжынерна-тэхнічных работнікаў, партыйных і профсаюзных арганізацый заключаецца ў тым, каб арганізаваць сапраўднае большэвіцкае кіраўніцтва новым палітычным і вытворчым узлымам мас, каб уцягнуць у спаборніцтва літаральна ўсіх працоўных, і да знамянальнага дня — выбараў у Вярхоўны Совет СССР прысці з датэрмінозым выкананнем галавых планаў.

ПЕРАД СВЯТАМ 5 СНЕЖНЯ

МАСКВА, 2 снежня. (БЕЛТА). Сталіца рыхтуецца адзначыць гадавіну прыняцця Сталінскай Канстытуцыі Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездам Советаў.

Совецкая плошча, усе памяшканні выбарчых акруговых і ўчастковых камісій, а таксама будынкі раённых советаў, наркаматаў і прадпрыемстваў святочна ўпрыгожваюцца. Вуліцы і плошчы будуць радыёфікаваны.

5 і 6 снежня, а 1 галзіне дня, ва ўсіх раёнах Масквы абудуцца мітынгі выбаршчыкаў, на якіх выступяць кандыдаты ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР. Сакратары раённых камітэтаў ВКП(б) і даверныя асобы раскажуць выбаршчыкам аб кандыдатах, зарэгістраваных акруговымі выбарчымі камісіямі Масквы для балатыравання ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР.

У святочныя дні на прадпрыемствах, ва ўстановах, у клубах і чырвоных кутках адбудуцца вечары, прысвечаныя Сталінскай Канстытуцыі.

Гадавіна прыняцця Сталінскай Канстытуцыі будзе адзначана таксама рознымі спартыўнымі спаборніцтвамі, карнавальнымі вечарамі, масавымі народнымі гуляннямі на плошчах, парках і стадыёнах.

Ва ўсіх школах 5 снежня арганізуюцца дзіцячыя ранішнікі.

ВЫБАРЧЫЯ УЧАСТКІ Ў ПАЯЗДАХ ДАЛЕКАГА СЛЕДВАННЯ

Прэзідыум Менскага гарадскога совета зацвердзіў склад участковых выбарчых камісій па выбарах у Совет Саюза і Совет Нацыянальнасцей у паяздах далёкага следвання. Выбарчыя ўчасткі арганізуюцца ў паяздах №№ 89, 90, 56, 72 і 55.

Апрача таго прэзідыум Менгорсовета зацвердзіў склад выбарчай камісіі ўчастка № 103, які ахапляе раён цагельнага завода № 1 і клінкернага завода.

Трэці дзень сталінскай дэкады стаханаўскіх рэкордаў

РАСТУЦЬ РАДЫ СТАХАНАЎЦАЎ, МНОЖАЦЦА ВЫТВОРЧЫЯ РЭКОРДЫ У ГОНАР ВЫБАРАЎ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ СССР

ВЫТВОРЧЫ ЎЗДЫМ НА АБУТКОВАЙ ФАБРЫЦЫ

Новымі вытворчымі рэкордамі сустракаюць дзень выбараў у Вярхоўны Совет рабочыя менскай абутковай фабрыкі імя Кагановіча. Група хлапчуковага абутку першага пашывачнага цэха дабілася высокай прадукцыйнасці працы. З снежня зацягнута 2.040 пар, пры плане 1.700 пар. Знатны стаханавец тав. Скабло Гірш адзін абслугоўваў увесь канвеер, зацягнуўшы 2.040 пар, пры норме 1.200 пар.

Новы рэкорд пастаўлен стаханаўцам тав. Андрэйчыкам, які, працуючы на працэсе з'ёмкі з калодак, апрацаваў 1.500 пар, пры норме 650 пар. Да гэтага часу найвышэйшай лічбай выканання на гэтым працэсе было 1.000 пар.

Стаханавец тав. Беда, працуючы па накладцы падэшвы, пры норме 880 пар, апрацаваў 1.500 пар. Да гэтага часу найвышэйшай выпрацоўкай па гэтаму працэсу было 1.100 пар.

Новыя рэкорды ўстаноўлены таксама перацяжчыкамі наскоў тт. Эльтэрманам і Ляхоўскім Аляксеем, якія, пры норме 440 пар, апрацавалі па 850 пар кожны.

Стаханавец Кауфман на працэсе прышыўкі падэшвы, пры норме 430 пар, апрацаваў 713 пар. Стаханавец Розенберг (цвікоўшчык), пры норме 925 пар, апрацаваў 1.740 пар.

Група парусінавага абутку, пры норме 1.452 пары, 3 снежня выпусціла 1.680 пар.

Стаханавец групы парусінавага абутку тав. Шіткевіч устанавіў рэкорд на працэсе прыбіўкі задкоў — пры норме 680 пар, ён апрацаваў 1.400 пар. Да гэтага часу рэкорднай выпрацоўкай лічылася 1.100 пар. Стаханавец тав. Ляхоўскі Фёдар, працуючы на заляжцы наскоў, пры норме 900 пар, апрацаваў 1.600 пар.

ПАКРОЎСКІ.

Рэкордамі адзначаюць падрыхтоўку да выбараў

БАРЫСАЎ. (Спец. кар. «Звязды»). З дня на дзень узнімаюць выпрацоўку стаханаўцы і рабочыя лесазавода імя Молатава. Кожны з іх стараецца адзначыць дні падрыхтоўкі да 12 снежня новымі выдатнымі рэкордамі. Стаханаўка тав. Сіроткіна на працэсе зафарбоўкі шафаў у першы дзень сталінскай дэкады стаханаўскіх рэкордаў выканала норму на 334 проц. Стаханаўка Шульц на гэтым-жа працэсе выканала норму на 259 проц.

З снежня стаханаўка Шульц устанавіла новы рэкорд. За змену яна выканала сваю норму на 442 проц. і зарабіла 24 рублі.

Стаханаўка Бабіцкая—вучаніца — дабілася выпрацоўкі ў 330 проц., Сіроткіна — 306 проц.

Добрыя паказальнікі далі сталяры па зборцы мэблі. Стаханавец Тумар даў 385 проц. нормы, Абезгаўз — 263 проц., Шчэрба — 327 проц.

Рэкордных паказальнікаў дабіліся стаханаўцы піяніннага цэха. Стаханавец Дайнека даў 330 проц. нормы, Русак — 260 проц.

За час стаханаўскай дэкады калектыў піяніннага цэха абавязаўся выпусціць э вытворчасці 8—9 піянін. Да 10 снежня цэх закончыць свой гадавы план. Усяго ён выпусціць да 200 піянін. Да канца года цэх выпусціць яшчэ дадатковa звыш плана 12—15 піянін.

Цэх па выпуску шчыпковых інструментаў ужо закончыў гадавы план. Цэх асвоіў новы від прадукцыі — выраб беларускага нацыянальнага інструмента цымбалаў. На сёння ўжо выпушчана 25 штук.

Высокая прадукцыйнасць— высокія заработкі

БАБРУЙСК. (Спец. кар. «Звязды»). Лепшыя стаханаўцы бабруйскіх прадпрыемстваў з першага дня сталінскага дэкалніка замацавалі за сабой рэкордную прадукцыйнасць. Высокая прадукцыйнасць дала высокія заработкі.

Стаханавец завода імя Сталіна, токар тав. Пархімовіч, працуючы на другой змене, 2 снежня даў 705 проц. дзённай нормы, зарабіў за змену 57 руб. Увесь завод выканаў сутачнае заданне на 109 проц. З снежня малады стаханавец-токар тав. Шэндаровіч даў за змену 315 проц., стругальшчык тав. Агейчык выканаў сваю норму на 358 проц.

2 снежня на фабрыцы імя Халтурына рэчык па дзеву тав. Кац выканаў сваю норму на 400 проц., зарабіўшы за змену 72 руб. 13 кап. Уся фабрыка выканала свой промфінплан гэтага дня на 133 проц.

На заводзе імя Варашылава небывалую да гэтага часу выпрацоўку далі стаханаўцы: шліфоўшчык тав. І. Рабчун — 402 проц., шліфоўшчык тав. Маслоў — 480 проц., слесар тав. Казлоўскі—318 проц., токар тав. І. Філіповіч — 464 проц., які зарабіў за сваю змену 35 руб., у лістападзе тав. І. Філіповіч зарабіў за месяц 1011 руб.

— У сталінскую дэкаду я абавязаўся зыконваць сваю дзённую норму не ніжэй чым на 400 проц., — гаворыць тав. Філіповіч. — гэта абапяпне я стрымаю і ўпэўнен, што сваё вытворчае заданне на дэкаду выканаю дэтэрмінова. Усе гэтыя рэкорды я прысвячаю вялікаму святу — 12 снежню — дню выбараў у Вярхоўны Совет СССР.

Неабходна адзначыць вельмі дрэнную работу бабруйскай электрастанцыі, якая кожны дзень па некалькі гадзін не падае электраэнергію на завод імя Варашылава, чым зрывае нармальны ход работы завода.

ДВАЖЫНСКІ.

Гадавую праграму выканалі датэрмінова

Рыхтуючыся да дня выбараў у Вярхоўны Совет СССР, наш калектыў скурзавода імя Сталіна (Магілеў) у адказ на адозву матальшчыц шаўковай фабрыкі і стаханаўцаў прадпрыемстваў г. Масквы узяў на сябе абавязацельствы датэрмінова выканаць план і палепшыць якасць прадукцыі. Мы абавязаліся давесці выкананне норм выпрацоўкі за 10 месяцаў у сярэднім па заводу да 138 проц., прадукцыйнасць працы да ўзроўню плана, знізіць сабекошт не менш, чым на 1 проц. супроць плана. Гэтыя абавязацельствы мы э гонарам выканалі.

Гадавая праграма завода выканана яшчэ 5 лістапада на 100,13 проц. Сярэдняе выкананне норм на аднаго рабочага складае 138,1 проц. План па прадукцыйнасці працы на аднаго рабочага быў выканан за 10 месяцаў на 100.4 проц. Калектыў завода перакрыў такім чынам недавыкананне за 8 месяцаў гэтага года. Зніжан сабекошт на 2,1 проц. супроць плана.

Побач з павелічэннем колькасных паказчыкаў завод дабіўся значнага павышэння якасці прадукцыі. У кастрычніку месяцы ўпершыню за ўвесь час існавання завода перавыкананы план па гатунковасці ялавай юфці і інш. скуратавараў. Так, юфці конскай па плану трэба было выпусціць 81,7 проц., выпушчана 84,28 проц. Цвёрдага тавара (падэшвенны) трэба было даць 98 проц., выпушчана 99,86 проц. Юфці ялавай абутковай першага гатунку, замест планавых 86,5 проц., выпушчана 86,81 проц.

Нашы поспехі з'яўляюцца прамым рэзультатам растучай палітычнай актыўнасці калектыва і росту стаханаўскага руху на заводзе. Калі на 1 кастрычніка ў нас было 59,7 проц. стаханаўцаў, то зараз мы маем ужо 70,3 проц. агульнага ліку рабочых.

У разгарнуўшымся спаборніцтве па дастойнай сустрэчы дня выбараў лепшыя паказчыкі далі: стаханавец адмочназольнага цэха, брыгадзір Фёдараў, які выканаў норму на 148 проц., Леонцьева — 175,9 проц., Блюмін Л. — 197 проц., Осіпаў — 187,5 проц., Пагуляеў — 184 проц., Барада — 164,7 проц., Гатальскі — 142 проц.

Да ўсіх брыгад прымацаваны грамадскія тэхнарукі э ліку лепшых інжынерна-тэхнічных работнікаў.

Перад нашым заводам стаяць зараз адказнейшыя задачы па выкананню абавязацельства па выпуску да канца года звыш планазай прадукцыі на 1.100 тысяч рублёў і падрыхтоўцы па асваенню праграмы 1938 года на аснове ўкаранення навейшых металаў работы.

Я разам з усім калектывам буду і надалей упарта змагацца за пярэдзінства нашага прадпрыемства, за далейшае палепшанне якасці прадукцыі.

Працоўныя нашай выбарчай акругі аказалі мне вялікі гонар, вылучыўшы кандыдатам у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей.

Я зыказваю сваю шчырую падзяку за аказанае мне вялікае давер'е многатысячнай масы выбаршчыкаў, вылучыўшай маю кандыдатуру. Гэта давер'е натхняе мяне, і я з падвоенай сілай і энергіяй буду змагацца за справу Леніна—Сталіна, за тое, каб апраўдаць давер'е працоўных.

А. І. ІВАНОЎ,
нам. дырэктара магілеўскага скурзавода імя Сталіна, кандыдат у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей па Магілеўскай выбарчай акрузе.

УСЕБЕЛАРУСКІ РЭКОРД т. К. С. ЕЖГУРАВАЙ і т. Т. С. ПОЛІЦАН

ВІЦЕБСК. 3 снежня. (Кар. «Звязды»). Сёння стаханаўкі швейна-кецельнага цэха панчошна-трыкатажнай фабрыкі імя Клары Цеткін Ежгурава Кіра Семёнаўна і Поліцан Тамара Сяргееўна на кетлёўцы мужчынскіх наскоў устанавілі новы ўсебеларускі рэкорд. Кожная з іх выпусціла па 80 дзесяткаў пар наскоў, замест існуючай нормы на чалавека ў 49 дзесяткаў пар, што з'яўляецца усебеларускім рэкордам у панчошна-трыкатажнай прамысловасці.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

559 проц. нормы

ГОМЕЛЬ. Першы дзень сталінскай дэкады стаханаўскіх рэкордаў стаханаўцы Гомеля спаткалі вялікімі перамогамі. На паравоза-вагонарамонтным заводзе фармаўшчык сталелітэйнага цэха тав. Кананчук па фармоўцы буферных стаканаў устанавіў рэкорд па заводу. У першы дзень дэкады ён выканаў норму на 559 проц. Каваль кавальскага цэха тав. Жалезняко па коўцы крукоў нескразной упражкі выканаў норму на 407 проц.

На заводзе «Гомсельмаш» у механа-зборачным цэху ўстаноўлена 11 новых рэкордаў. Стаханаўцы Плотнікаў і Самойленка выканалі сваю норму на 314 проц. Гэтага яны дабіліся тым, што зрабілі паміж сабой разэдзяленне працэса апрацоўкі — адзін рабіў расточку дэталей, а другі іх абтачваў і падразаў. У кавальска-прэсазальным цэху штампоўшчыкі Волкаў і Цімафеенка перакрылі рэкорды Плотнікава і Самойленка. Яны па прышыўцы восей выканалі норму на 333 проц. Замест 120 восей яны прашылі 400.

У другі дзень сталінскай дэкады на станкабудаўнічым заводзе імя Кірава каваль механа-зборачнага цэха тав. Эстрын па коўцы балтоў пры норме ў 42 па плану, даў 150 балтоў — 390 проц. плана, казаль тав. Крычаўцоў выканаў план на 325 проц. і зарабіў за змену 85 рублёў.

Вялікімі дасягненнямі спаткалі другі дзень сталінскай дэкады і іншыя заводы Гомеля. Так, завод «Чырвоны хімік» выканаў дзённы план на 145 проц., дрэваапрацоўчы камбінат — на 135 проц., а абсная вытворчасць камбіната выканала план на 182 проц.

Тармозяць разгортванне стаханаўскага руху

Рабочыя завода імя Варашылава з вялікай радасцю сустрэлі сталінскую дэкаду стаханаўскіх рэкордаў, якая праводзіцца ў гонар 12 снежня — дня выбараў у Вярхоўны Совет СССР.

Першы дзень стаханаўскай дэкады многія стаханаўцы завода сустрэлі новымі рэкордамі.

Высокую прадукцыйнасць працы даюць фармаўшчыкі тт. Загорскі, Ігнатовіч В., Аўласевіч, токар Барсукоў, Шабан і іншыя рабочыя. Фармаўшчык-вучань т. Ліднер выканаў норму 1 снежня на 150 проц., а 2 снежня — на 238 проц.

У першы дзень стаханаўскай дэкады на заводзе выявілася шмат розных арганізацыйна-вытворчых непаладкаў. Зарозакіраўніцтва, начальнікі аддзелаў і цэхаў не падрыхтаваліся, як след, да стаханаўскай дэкады.

Аддзел забеспячэння (нач. тав. Ключ) нічога не зрабіў для таго, каб забяспечыць рабочых усім неабходным інструментам і матэрыялам. Па-ранейшаму рабочыя механічнага цэха прастайваюць з прычыны нелахопу інструментаў. У інструментальнай кладовай завода адсутнічаюць напільнікі драчовыя і лічныя розных размераў, свёрлы — дыяметрам у 6 міліметраў. Вельмі патрэбен мікрометр 150—200 міліметраў і іншы інструмент.

У механічным цэху ў першы дзень стаханаўскага дэкадніка прапавалі не ўсе станкі. Фрэзерны станок № 103, які так доўга рамантаваўся, не працуе і па сёння толькі таму, што інструментальны цэх (начальнік Бурухін) не прыгатаваў апраўкі. Стаханавец-токар тав. Юдэльзон 1-га снежня зусім не працаваў, бо не было рэзцатрымацеля (загатовіць рэзцатрымацель магчыма за адну гадзіну). Стаханавец тав. Піндрык, які асвоіў працэс працы на трох фрэзерных станках, працуе толькі на адным станку. Планавы аддзел не забяспечыў тав. Піндрыку поўную стаханаўскую нагрузку.

Вельмі перашкаджае разгортванню стаханаўскага руху на заводзе няўвязка паміж цэхамі. Адзін цэх зрывае працу другому. Парушаюцца пазменныя графікі. Вось, напрыклад, ліпейны цэх павінен быў даць 1 снежня механічнаму цэху балты прэс-ганца, самазмазваючыя кольцы, бронзавыя ўтулкі і шмат іншых дэталяў. Гэтыя дэталі не паступілі. Нарыхтоўчы цэх таксама не даў даў шмат дэталяў. У выніку — атрымліваюцца вялікія перабоі ў працы рабочых слясарна-зборачнага цэха. У гэтым цэху рабочыя першыя 15 дзён кожнага месяца нагружаны на 30—40 проц., чым стваравоцца масавыя прастоі ў цэху, апошнія-ж 10—5 дзён пачынаецца «штурмаўшчына» і звышчасовая работа. Так атрымалася і зараз. Рабочыя слясарна-зборачнага цэха, асабліва ў брыгадзе па зборцы свідравальных станкоў прастайваюць цэлымі гадзінамі ў чаканні работы. Амаль такое-ж становішча і ў іншых брыгадах.

Дрэнная арганізацыя працы на заводзе імя Варашылава — сур'ёзны тормаз для разгортвання стаханаўскага руху. Дырэктар завода тав. Лісоўскі не прымае мер да таго, каб наладзіць бесперабойную работу цэхаў. Тут, як вілаць, усё разлічана на самацёк і штурмаўшчыну.

Г.

МЕНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА

БУДЗЕМ ГАЛАСАВАЦЬ ЗА т. К. Е. ВАРАШЫЛАВА і т. В. Г. ВАНЕЕВА

НА ПЕРАДВЫБАРЧЫМ СХОДЗЕ Ў МЕНСКІМ ВАЕННЫМ ВУЧЫЛІШЧЫ

1 снежня па перадвыбарчым сходзе курсантаў, каманднага і начальніцкага складу Менскага ваеннага вучылішча выступіў кандыдат у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР тав. Ванееў. Цёпла сустрэты выбаршчыкамі, тав. Ванееў расказаў сваю біяграфію.

Ён запэўніў курсантаў і камандзіраў вучылішча ў сваёй гатоўнасці, не шкадуючы сіл, не шкадуючы жыцця, змагацца за вялікую справу партыі Леніна—Сталіна, не складаючы рук працаваць на карысць сваёй цудоўнай радзімы, каб апраўдаць давер'е сваіх выбаршчыкаў. На сходзе выступілі курсанты вучылішча.

ПРАМОВА тав. КОЎБА

Я выступаю поўны радасці і шчасця, што перажывае зараз уся наша краіна. Некалькі дзён аддзяляюць нас ад таго дня, які ўвойдзе ў гісторыю, як дзень найвялікшага народнага свята, народнай радасці. Некалькі дзён аддзяляюць нас ад дня выбараў у Вярхоўны Совет па самай дэмакратычнай з усіх канстытуцый, якія толькі ведала гісторыя, — па Канстытуцыі, якую даў нам вялікі Сталін.

Вялізная радасць перапаўняе мяне яшчэ і таму, што мне, поўнапраўнаму выбаршчыку вышэйшага органа ўлады маёй краіны, выпаў гонар галасаваць за бліжэйшага саратніка вялікага Сталіна, за стойкага, непрымірымага большэвіка, за Клімента Ефрэмавіча Варашылава. **(Бурныя апладысменты).** Гэты вялікі гонар я, як і ўсе мы, курсанты, будучыя камандзіры Чырвонай Арміі, абавязан апраўдаць узорнымі паказальнікамі ва ўчобе і рабоце. Мы павінны так авалодаць ваеннай справай, каб заўсёды быць гатовымі па-варашылаўску біць ворага там, адкуль ён адважыцца напасці на нашу цудоўную радзіму.

Пад мудрым кіраўніцтвам вялікага Сталіна тав. Варашылаў зрабіў РСЧА першакласнай арміяй свету. Пад варашылаўскім валодзіцельствам Чырвоная Армія стала бічом, перад якою трапечуць ворагі, якой баяцца самыя фарсістыя з падпальшчыкаў вайны. Пад валодзіцельствам Варашылава Чырвоная Армія разгроміць любога ворага або саюз ворагаў.

Не толькі галасы, жыццё сваё кожны з нас гатоў аддаць нашай партыі. Нязмерна гордасць, з якой мы аддадзім свае галасы вернаму сыну партыі тав. Варашылаву! **(Бурныя апладысменты).**

Наша партыя выхавала нямала стойкіх, верных барацьбітоў за справу Леніна—Сталіна. Сярод мільёнаў будаўнікоў комуністычнага грамадства нямала тых, каму мы маем права даверыць справу кіравання нашай краінай. Я ўважліва слухаў прамову тав. Ванеева, і ўпэўнены, што ён будзе дастойным нашым дэпутатам у Совет Нацыянальнасцей. Буду галасаваць за тав. Ванеева.

ПРАМОВА тав. ДАМАРАЦКАГА

Увесь совецкі народ першым сваім кандыдатам намеціў таго, каму ён абавязан сваім шчаслівым, выдатным жыццём — таварыша Сталіна. З імем Сталіна на вуснах мы пойдзем да выбарчых урнаў, каб галасаваць за верных сыноў нашай радзімы. На нашу долю выпала шчасце галасаваць за бліжэйшага саратніка вялікага Сталіна — таварыша Варашылава. І ад таго з асаблівай нясцерпнасцю мы чакаем дня 12 снежня. Мы будзем галасаваць за тазарыша Варашылава! **(Апладысменты).**

У глыбокім падполлі, разам з Леніным і Сталіным, пад іх кіраўніцтвам, іх верным вучнем самааддана працаваў тав. Варашылаў. Разам з Леніным і Сталіным, выконваючы іх баявыя заданні, Варашылаў грамеў полчышчы інтэрвентаў. Пад кіраўніцтвам Сталіна Варашылаў бязлітасна выкарчоўвае гнёзды подлых фашысцкіх шпіёнаў, трацкістаў, бухарынцаў і ўсю іх здрадлівую зграю.

З кожным днём мацнее абаронная магутнасць Совецкага Саюза. Яго Чырвонай Арміі ўстрашаюцца ворагі, і ў гэтым не малая заслуга выпрабаванага сталінца Варашылава.

Армія нашай краіны — гэта ўвесь шматмільённы совецкі народ. Па закліку партыі, пад валодзіцельствам пролетарскага маршала Варашылава, ён зможа даць знішчаючы ўдар усякаму ворагу. Наша партыя ўзброена самай вострай зброяй. Гэтая зброя выкавана і адточана геніямі чалавецтва Марксам, Энгельсам, Леніным і Сталіным. Нашы галасы мы аддадзім таму, хто ўсё сваё жыццё верны непераможнаму спягу Маркса — Энгельса — Леніна Сталіна, хто ўсё сваё жыццё — бясстрашны салдат рэволюцыі — таварышу Варашылаву. **(Апладысменты).**

На нашым сходзе выступаў кандыдат у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей тав. Ванееў. Ён адзін з тых, каго ўзрасціла і выхавала стойкім большэвіком наша партыя. Мы спадзяемся, што тав. Ванееў, абкружаны нашым давер'ем, будзе працаваць яшчэ лепш, будзе заўсёды, усюды стойкім барацьбітом за справу Леніна—Сталіна. Будзем галасаваць за таварыша Ванеева, выбярэм яго ў дэпутаты Совета Нацыянальнасцей.

СЕМІНАР ПА ПЫТАННЯХ ТЭХНІКІ ВЫБАРАЎ

Учора ў Доме партактыва ў Менску з 9 гадзін раніцы да 3 гадзін дня праводзіўся семінар па пытаннях тэхнікі выбараў у Вярхоўны Совет СССР. У ім прынялі ўдзел да 200 старшынь і сакратароў участковых выбарчых камісій Менска. Семінар праводзіў выконваючы абавязкі сакратара гаркома КП(б)Б тав. Мацвееў, які азнаёміў сабраўшыхся з усімі пытаннямі тэхнікі выбараў. Работнікі ўчастковых камісій задалі каля 200 пытанняў. Тут-жа ў зале для наглядной ілюстрацыі па семінара былі расстаўлены сталы, паказан парадак расстаноўкі кабін, выдачы бюлетэняў і т. д.

Пасля заняткаў для ўдзельнікаў семінара дэманстраваўся кінофільм аб тэхніцы правядзення выбараў у Вярхоўны Совет СССР.

Майстар вагоназборачнага цэха Асіпавіцкага вагонарамонтнага пункта комсамолец-агітатар тав. І. Б. Герчыкаў праводзіць гутарку з рабочымі аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР. (БСФ).

ПІСЬМЫ ВЫБАРШЧЫКАЎ

ПАРТКОМ НЕ КІРУЕ РАБОТАЙ НА ВЫБАРЧЫМ УЧАСТКУ

Час, які астаўся да дня выбараў у Вярхоўны Совет Саюза ССР, трэба скарыстаць для разгортвання глыбокай агітацыйна-масавай работы за кандыдатаў у дэпутаты.

Як-жа разгорнута гэта работа на 58 выбарчым участку горада Віцебска? Далёка недастаткова. Партыйная арганізацыя фабрыкі імя Клары Цэткін (сакратар парткома т. Астроўская) зусім не цікавіцца становішчам агітацыйна-прапагандысцкай работы на ўчастку, і гэта ў той час, калі яна прымацавана да гэтага ўчастка. Ніхто з парткома на ўчастку яшчэ не быў. Даверанага т. Маскалёва не слухалі на парткоме ні аднаго разу аб становішчы агітацыйна-прапагандысцкай работы. Партком абмежаваўся толькі тым, што 16 лістапада вылучыў комуністку т. Гобергрун у дапамогу даверанаму. Калі прасілі тав. Астроўскую вылучыць чатырох комуністаў на 24 лістапада для кансультацыі па пытаннях выбарчага закона, яна ні аднаго чалавека не дала. З усяго гэтага можна зрабіць вывад аб «рабоце» партыйнай арганізацыі на сваім выбарчым участку.

7-мю гурткамі па вывучэнню выбарчага закона на ўчастку ахоплена 139 хатніх гаспадынь. Гэта лічба гаворыць аб тым, што далёка не ўсе выбаршчыкі ўчастка ахоплены выбарчай прапагандай і агітацыяй. Можна прывесці такі яркі прыклад: 26 лістапада ў памяшканне выбарчага ўчастка з'явілася грамадзянка Бясспрозваная, якая пражывае па вуліцы Кірава, і заявіла, што ў іх доме № 26 не арганізаваны гурткі па вывучэнню выбарчага закона, у той час, як у гэтым доме пражывае каля 30 хатніх гаспадынь.

Такія заявы неадзінкавы. Многія выбаршчыкі прыходзяць ва ўчастковую камісію з прэтэнзіямі, чаму з імі ніхто не займаецца. Гэта гаворыць аб тым, што людзі, якім была даручана агітацыйна-масавая работа на ўчастку, несур'ёзна адносяцца да даручанай ім справы. Прымацаваны гаркомам партыі да ўчастка прапагандыст тав. Баварскі ні разу яшчэ на ўчастку не быў і даверанага т. Маскалёў яго зусім не ведае. Агітатараў, якія кіруюць гурткамі, ніхто не склікае для інструктажа. Беспартыйны актыў, пражываючы на тэрыторыі ўчастка, не выяўлен і не прыцягнут да агітацыйна-масавай работы.

МІЛАЕВА.

ВОРАГІ СКАРЫСТОЎВАЮЦЬ БЯЗДЗЕЙНАСЦЬ РАЕННЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

У Асвейскім раёне слаба пастаўлена агітацыйна-масавая работа. У радзе калгасаў і сельсоветаў выбаршчыкі яшчэ як след не знаёмы са Сталінскай Канстытуцыяй і новым выбарчым законам. Пры складанні спіскаў выбаршчыкаў сельсоветы дапусцілі многа памылак і скажэнняў. У Малашкоўскім сельсавеце не ўключаны ў спіскі 9 выбаршчыкаў, а некаторыя выбаршчыкі занесены ў спіскі па 2—3 разы.

Выкарыстоўваючы бяздзейнасць бязрукіх кіраўнікоў раёна, заварушыліся царкоўнікі і сектанты. На вачах Кожанаўскага сельсавета і раённых арганізацый у калгасе «Чырвоныя стралкі» царкоўнікі на чале з мясцовым папом праводзяць контрэволюцыйную агітацыю сярод выбаршчыкаў.

Г. ЯСЮЦІН.

МІТЫНГ У ЖЛОБІНЕ

Днямі ў Жлобіне адбыўся васьмітысячны перадвыбарчы мітынг. На стадыён з чырвонымі спягамі і лозунгамі прышлі калоны рабочых і служачых прадпрыемстваў і ўстаноў горада, чыгуначнага вузла, члены прамысловых арцелей, хатнія гаспадыні, калгаснікі — усяго больш 8 тысяч чалавек.

Сакратар райкома КП(б)Б тав. Гутнер адкрывае мітынг. Слова прадастаўляецца кандыдату ў дэпутаты Совета Саюза па Рагачоўскай выбарчай акрузе тав. Іванову Васілію Паўлавічу.

Выступаўшыя таварышы Сенатараў, Мігай і Адамовіч гаварылі аб адданасці совецкага народа социялістычнай радзіме, выказвалі сваю падзяку партыі і ўраду, дарагому правадыру таварышу Сталіну за вышчаслівае жыццё і заклікалі ўсіх выбаршчыкаў аддаць 12 снежня свае галасы за дастойных кандыдатаў В. П. Іванова і Е. Н. Мінаву.

ПРАМОВА тав. ІВАНОВА

Таварышы! Дазвольце перадаць сваю сардэчную падзяку працоўным Рагачоўскай выбарчай акругі, якія вылучылі мяне кандыдатам у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР.

Таварышы! Наш дарагі правадыр таварыш Сталін, пад кіраўніцтвам якога совецкі народ дабіўся велізарнейшых перамог, на Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездзе Советаў сказаў аб нашай совецкай інтэлігенцыі, што «яна з'яўляецца цяпер роўнапраўным членам совецкага грамадства, бо яна разам з рабочымі і сялянамі, у адной упражцы з імі, вядзе будоўлю новага бясклясавага социялістычнага грамадства».

Да такой новай совецкай інтэлігенцыі аднашуся і я. Нарадзіўся я ў сям'і рабочага-чыгуначніка Сіропінскага раёна. Пасля сканчэння сямігодкі ў 1928 годзе некаторы час працаваў рамонтным рабочым на транспарце. Совецкая ўлада дала мне магчымасць вучыцца далей. Я скончыў тэхнікум, стаў настаўнікам. Мяне вырасціла і выхавала совецкая ўлада, партыя Леніна—Сталіна.

Совецкаму настаўніку партыя і ўрад даверяюць адказнейшы ўчастак работы — выхаванне з маладога пакалення будучых будаўнікоў комунізма. Совецкага настаўніка партыя і ўрад узнялі на такую вышыню, на якой не мог і не можа стаць настаўнік ні ў адной капіталістычнай краіне. Адказную ганаровую работу совецкага настаўніка я і выконваю. 4 годы працаваў дырэктарам Чырвона-Асавецкай сямігодкі, Быхаўскага раёна, цяпер вылучан дырэктарам школы медыцынскіх сясцёр.

Сёння перад вамі на мітынгу заяўляю, што пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна я ўсю сваю сілу, усю сваю энергію, а калі патрэбна будзе, і сваё жыццё, аддам за справу Леніна—Сталіна, за далейшы росквіт нашай социялістычнай радзімы.

Няхай жыве комуністычная партыя і правадыр сусветнага пролетарыята таварыш Сталін! **(Бурныя апладысменты).**

ПРАМОВА тав. АДАМОВІЧ

Ад імя хатніх гаспадынь горада Жлобіна кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета — Іванову Васілію Паўлавічу і Мінавай Еўдакіі Несцераўнай — наша палкае прывітанне!

Таварышы! Недалёкім з'яўляецца дзень 12 снежня, калі мы ўсе з вамі пойдзем выбіраць па нашай Сталінскай Канстытуцыі дэпутатаў Вярхоўнага Совета. Мы, хатнія гаспадыні горада Жлобіна, усе актыўна ўдзельнічаем у падрыхтоўцы да выбараў і 12 снежня ўсе, як адна, прыйдзем на выбарчыя ўчасткі і аддадзім свае галасы лепшым патрыётам нашай радзімы.

Хто з нас мог падумаць у старыя годы парызма, што мы будзем мець права выбіраць і быць выбранымі? Раней у царскую думу выбіраліся толькі князі, памешчыкі, кулакі, папы і ім падобныя. А мы нават добра і не ведалі, якія там праходзяць «выбары».

Мой бацька быў рабочым. Сям'я складалася з 9 чалавек. Жылі ў вельмі дрэнных матэрыяльных і кватэрных умовах. Цяпер, дзякуючы таварышу Сталіну, мы жывем радасна і шчасліва. Жывем у светлых, чыстых кватэрах, слухаем радыё, чытаем кнігі і газеты. Наша старасць забяспечана. Мой муж пенсіянер, але ён і зараз не адстае ад нашых маладых работнікаў і актыўна дапамагае падрыхтоўваць маладыя кадры для чыгуначнага транспарту. Мой адзін сын—лейтэнант Чырвонай Арміі, другі — лётчык, трэці — брыгадзір рамонтнай брыгады на чыгунцы, дзве дачкі — тэхнікі сувязі. У такі час і мне, 63-гадовай жанчыне, не хочацца сядзець дома. Я з'яўляюся дэпутатам Жлобінскага горсовета і з гонарам выконваю ўсе грамадскія даручэнні. Калі патрэбна будзе, то і я, не шкадуючы сваіх сіл і жыцця, пайду за сваімі сынамі і дачкамі абараняць сваю радзіму. **(Бурныя апладысменты).**

Мы выбярэм у дэпутаты Вярхоўнага Совета тт. Іванова і Мінаву, як апраўдаўшых сябе і даўшых лепшыя ўзоры работы ў карысць нашай радзімы.

Няхай жыве Сталінская Канстытуцыя!

Няхай жыве комуністычная партыя большэвікоў!

Няхай жывуць нашы кандыдаты ў дэпутаты Вярхоўнага Совета тт. Іваноў і Мінава!

Няхай жыве любімы вялікі правадыр таварыш Сталін! **(Бурныя апладысменты).**

НА ВЫБАРЧЫХ УЧАСТКАХ

УСЕ ГУРТКІ мастацкай самадзейнасці гомельскага чыгуначнага клуба імя Леніна прымаюць актыўны ўдзел у абслугоўванні выбаршчыкаў на ўчастках. Перад выбаршчыкамі выступаюць танцоры, спевакі, музыканты і дэкламатары.

Кіраўнікі клуба склалі план абслугоўвання выбарчых участкаў гурткамі самадзейнасці да 12 снежня.

УЗОРНА АРГАНІЗАВАНА агітацыйна-масавая работа на 105 выбарчым участку, які знаходзіцца на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна (Мазырская выбарчая акруга). Даверэны тав. **Мінкін** склаў календарны план работы. Усе выбаршчыкі ахоплены гурткамі па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР». Штодзённа вядзецца агітацыя за вылучаных кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР.

СТАЛІНСКАЯ ШКОЛА ў гор. Добрушы знаходзіцца ў цэнтры выбарчага ўчастка. У гэтай школе размяшчаецца ўчастковая выбарчая камісія. Памяшканне выбарчай камісіі ўпрыгожана лозунгамі, плакатамі, партрэтамі кіраўнікоў партыі і ўрада.

У школе зроблена вітрына, прысвечаная кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР тт. Альтшулеру Г. В. і Фінагенаву М. Ц. У пакоі, дзе будзе адбывацца тайнае галасаванне, устаноўлена 10 кабін.

АРШАНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА

КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ СОВЕТА САЮЗА

Данііл Якаўлевіч НАВІЦКІ

Шырокі стол засланы чыстым абрусам. У хаце дастатковая колькасць святла. За сталом сядзіць удзельнік двух войнаў, безямельны ў мінулым батрак, а зараз калгаснік Якаў Парфіравіч Навіцкі. Побач з ім, нахіліўшыся на спінку крэсла, з весёлай радаснай усмешкай на твары, з прыгожанымі двума ордэнамі Саюза ССР грудзьмі сядзіць кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР, танкіст Данііл Якаўлевіч Навіцкі. Данііл—шосты сын у Якава Парфіравіча. Мы просім старыка расказаць пра сына, пра сваё мінулае жыццё.

— Добра,—гаворыць Якаў Парфіравіч,—у такі ўрачысты час, калі ўся наша сям'я перажывае найвялікшае шчасце, варта прыпомніць і былое.

— Ведаеце,—паглядзеў ён на свае рукі,—я хацеў-бы пачаць размову з рук. Яны былі каравыя і патрэсканыя да касцей. Гліна і вада разбурала іх. Самі падумайце—з гэтых рук да рэволюцыі жыла ўся сямья. Гэтыя рукі рабілі шчасце маім сынам. Але ні адзін з іх шчасця не ўбачыў да Кастрычніцкай рэволюцыі.

— Жыў у беспросветным горы і галечы. Так жыў, між іншым, і бацька мой. Памятаю, што нашу курню аднойчы пан Каспаровіч перагарадзіў коллямі надвое. У адной палове мы маглі жыць, а ў другой—не. Валу падавалі праз вокны, і то тайком і ўкрадкай. Няўгода пану прыводзіла да разбурэння. І ішлі далей, шукалі прытулку ў другіх месцах, каб хоць курню паставіць было дзе. Месца на зямлі не было для яе. Ганчара да вёскі кулакі не падпускалі. Пэўна, гаршкі мужыцкія маглі спаборнічаць з гаршкамі кулацкімі... А курня? О, гэта «прыемная» штука,—з усмешкай растлумачвае Якаў Парфіравіч.

Курня—гэта лазня мінулага ў горшым сэнсе гэтага слова. У ёй было маленькае вакенца, земляны падмост і печка з каменя і без дымапраходу. Калі тапілася курня, трэба было ўсім выходзіць. Зімойжа завязвалі вочы і лажыліся да зямлі, пакуль не сойдзе дым.

У такой курні да рэволюцыі жыў і наш кандыдат у Вярхоўны Совет Данііл Якаўлевіч Навіцкі.

Данііл падняўся і выпраміўся. Ён з задаволеннем слухаў расказ свайго бацькі

пра мінулае. Рос і выхоўваўся Данііл у годы совецкай улады. Яго дзяцінства падобна дзяцінству дзесяткаў мільёнаў юнакоў і дзяўчат—комсамольцаў, гарачых патрыётаў сваёй радзімы. Дапамагаючы бацьку ў гаспадарцы (пасля рэволюцыі Якаў Навіцкі ўжо меў каля 8 га зямлі на 13 душ сям'і), Данііл меў магчымасць вучыцца. А старэйшыя браты яго, вырасшыя да рэволюцыі, гэтай магчымасці не мелі. Данііл скончыў васковую школу. Гаручы жаданнем да вучобы і абавязкова да вучобы ў горадзе, Данііл атрымаў магчымасць вучыцца ў Оршы. За 7 кілометраў ён штодзённа хадзіў у сямігодку. Кожнай раніцай шустрага хлапчука любоўна будзіла маці Анна Іванаўна і выпраўляла ў школу.

Знаёмства з горадам, вучобай ў сямігодцы пакінулі ў Данііла найлепшыя ўспаміны. Ён быў актыўным вучнем, добрым і чулым таварышом. Лепшым па паспяховасці ён пакінуў сцены сямігодкі ў 1929 годзе. Перад юнаком адкрывалася шырокая дарога, шырокія перспектывы, магчымасці. З гэтага, па сутнасці, і пачынаецца біяграфія нашага кандыдата.

Данііл выбраў асаблівы для сябе шлях пасля вучобы. Ён пайшоў на вытворчасць. З 1930 года працаўлюбівага, моцнага і лоўкага хлапца мы бачым на дарожным будаўніцтве. Данііл памятаў пры гэтым, што чатыры браты яго ў Чырвонай Арміі і яму хутка чарга прыйдзе. Каб быць дастойным байца-чырвонаармейца, трэба заваяваць гэта працай...

Так і збылося. Данііл Навіцкі, не пакідаючы вытворчасці, працаваў на дарожным будаўніцтве пяць гадоў да дня ўходу ў Чырвоную Армію. Што можна сказаць пра гэтыя пяць гадоў?

— Я стаў чалавекам, узмужаў і вырас, стаў спецыялістам,—адказвае Данііл Якаўлевіч.

Працуючы на дарожным будаўніцтве, Данііл прайшоў школу работы і вучобы. У вучэбным камбінаце ён быў лепшым брыгадзірам. Яго брыгада па ўкатцы ішла ўвесь час наперадзе, машыны працавалі спраўна, без аварый, гаручае брыгада эканоміла. Невыпадкова, напрыклад, такая дэталь, што за ўсе пяць год Навіцкі не меў ніводнага спагнання, за тое дзесяткі разоў быў прэміраваны.

У працы знайшоў Данііл і спецыяльнасць, якую горача любіць. Ён стаў механікам. Заветная мара—працаваць на машыне—ажыццявілася. Данііл, што добры ўрач, ведае ўсё нутро машыны, ведае яе непаладкі і ведае, якія сродкі трэба ўжыць, каб арганізм машыны заўсёды працаваў бездакорна, беззаганна. Перад уходам у рады Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі Данііл быў вылучан на пасаду інструктара. Навыкі і веды, атрыманыя на будаўніцтве, ён тут-жа пазнеў быў перадаваць маладым рабочым. І як лепшы работнік, ён зноў быў прэміраваны.

Уступіўшы ў 1931 годзе ў комсамол, Данііл вырас у актыўнага грамадскага работніка. Моладзь вучдора ведала яго як лепшага арганізатара, масавіка, сваім уласным прыкладам заклікаючага да вытворчых поспехаў. Стаханаўца-комсамольца Навіцкага комсамольцы выбіраюць сакратаром камітэта. Ініцыятыўны і адданы справе партыі, Данііл кіраваў два годы комсамольскай арганізацыяй. Комсамольцы праважалі яго ў армію з самымі лепшымі пачуццямі і жадалі яму яшчэ большых поспехаў.

***

— Я ведаю, што шосты сын мой, ідучы ў Чырвоную Армію пятым, будзе не горшым за тых чатырох, якія, знаходзячыся ў яе радах, не падводзяць старога. Не дапусціць і Данііл, каб бацька яго чырванеў...

Так гаварыў стары Навіцкі, выпраўляючы пятага сына ў Чырвоную Армію.

Не падвёў Данііл нікога. Ён апраўдаў надзеі бацькі і комсамольцаў, якія радасна праважалі яго ў любімую дарогу. Ужо з першых дзён прабывання ў броне-танкавай часці, Данііл заслугоўвае да сябе павагу і любоў радавых байцоў, камандзіраў і палітработнікаў.

У часе тактычных вучэнняў 1936 года Данііл, знаходзячыся на сваім танку на рашаючым участку, бліскуча праводзіць складаную аперацыю, выдатна выконвае заданне, выводзіць танк з «бою» абсалютна здаровым. Правільны разлік і кемлівасць, адвага і рашучасць вылучаюць яго, як аднаго з лепшых стаханаўцаў-валзіцеляў. У першы год прабывання ў арміі Навіцкі быў дастойна адзначан. За выдатную баявую і палітычную падрыхтоўку ён быў першым стаханаўцам сваёй часці, меў пяць падзяк ад вышэйшага камандавання, атрымаў дзве грашовыя ўзнагароды і дзесяцідзённы адпачынак.

Калі скромна і каротка аб гэтым апавядае сын, бацька пачынае чагосьці хвалявацца. Якаву Парфіравічу прышлося быць на фронце руска-японскай вайны ў 1904 годзе і на імперыялістычнай вайне 1914 года. Ён не можа не ўспомніць пра сваю доўгую невыносную службу ў царскай арміі, пра мацяршчыну і пабоі, якія атрымліваў ён на кожным броку.

— У 1904 годзе, — гаворыць стары, — я быў пад Мукдэнам. З 45-га Выбаргскага палка нас засталося 15 ці 16 чалавек. Толькі ранение выратавала нас. інакш...

І ён недаказаў. Але мы разумеем, як ненавідзіць ён мінулае, як ненавідзіць крывяпралітную вайну.

Расказаў Якаў Парфіравіч і пра годы прабывання на фронце імперыялістычнай вайны.

— Гэта пекла, катарга ці яшчэ нешта страшнейшае было. Нас ні на крок нікулы не адпускалі. Заняткі і трэніроўкі без колла не праходзілі. Не адзін раз я за тое, што не перапрыгваў канаву, быў да беспрытомнасці збіты. Якімі-б валікімі пабоі ні былі, да ўрача не ідзі, бо горш будзе.

А зараз...

— Зараз я баец і ён камандзір, — перабіваючы бацьку, Данііл паказвае на фото, што вісіць на сцяне, свайго старэйшага брата лейтэнанта, — родныя браты. Так родны і блізкі ўсе байцы і камандзіры нашай Чырвонай Арміі. Гэта і робіць нас непераможнымі.

Якаў Парфіравіч заміваў галавою ў знак згоды з сынам.

Танкіст Данііл Навіцкі аб сабе мала гаворыць. За тое, ён як гарачы патрыёт сваёй радзімы, сваёй любімай Чырвонай Арміі, ўмее даказаць справай сваю адданасць народу, партыі Леніна—Сталіна.

Другі год прабывання ў радах слаўных сыноў слаўнай выхавальніцы герояў Чырвонай Арміі прынёс Даніілу неўвядальную славу. У студзені 1937 года совецкі ўрад за зыдатную баявую і палітычную падрыхтоўку ўзнагародзіў сына ганчара, радавога танкіста ордэнам Чырвонай Звязды.

— Атрымліваючы ордэн з рук Міхаіла Іванавіча Калініна,—гаворыць Данііл, — я, як ніколі, адчуў магутнасць сваёй радзімы і адчуў сябе, радавога хлапца з вёскі, комсамольца з дарожнага будаўніцтва, на небывалай вышыні...

Гэта так. Мільёны людзей з вёскі ўзняла, выпеставала і паставіла на ногі совецкая ўлада. Яна кожнаму ўручыла ключ ад уласнага шчасця. Жыві і працуй уладна, па-стаханаўску, чэсна — і шчасце ў тваіх руках.

Ішлі дні баявой і палітычнай вучобы. Гэта было лета 1937 года. Танкіст Навіцкі — па-ранейшаму адданы справе і горача любіць сваю машыну. З ёю ён дзеліць сваю радасць, звязан сваімі пачуццямі, з ёю ён праносіць наперад сваё жыццё — слаўнае, баявое, геройскае. Машына — друг Данііла ў штодзённай крапатлівай рабоце. Данііл удасканальвае свае веды, павышае культуру, мужае і расце. Ён гатоў, як і тысячы байцоў слаўнай Чырвонай Арміі, выканаць любое заданне слаўнага абароны Кліма Варашылава, большэвіцкай партыі, сваёй социялістычнай радзімы.

. . . . . .

Ліпень месяц 1937 года. За выкананне адказнага ўрадавага задання па ўмацаванню абароннай магутнасці краіны і праяўлены ў гэтай справе гераізм Данііл Якаўлевіч Навіцкі ўзнагароджан совецкім урадам другім ордэнам — ордэнам Чырвонага Сцяга. Спецыяльным загадам Клімента Ефрэмавіча Варашылава тав. Навіцкі заверджан у званні лейтэнанта.

— Усё жыццё маё, усе сілы і здольнасці, — гаворыць Данііл, — я аддам справе партыі Леніна—Сталіна, аддам нашай святой справе — умацаванню абароназдольнасці СССР.

***

Лейтэнант Навіцкі доблесны герой нашай сталінскай эпохі. Ён усім сваім сэрцам з народам, з партыяй Леніна — Сталіна. Яго шлях — шлях мільёнаў маладых людзей, доблесных патрыётаў совецкай дзяржавы. Яго імкненне — імкненне совецкага народа. Яго жаданне—жаданне ісці наперад, да новых перамог на ўсіх участках вялікай будоўлі социялізма, працаваць лепш, працаваць на карысць свайго народа, які давярае яму. З пачуццём раднаснага хвалявання ўспрымае тав. Навіцкі аказанае яму давер'е працоўнымі Аршанскай выбарчай акругі, якія вылучылі яго сваім кандыдатам у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР. Няма сумнення, што гэтым давер'ем ён будзе даражыць, як сваім уласным жыццём.

А галасаваць за тав. Навіцкага, гэта значыць галасаваць за шчаслівую моладзь, сталінскіх пітомцаў, гордых патрыётаў, выхаваных партыяй Леніна — Сталіна, галасаваць за непераможную ленінска-сталінскую справу.

г. Орша. **Пав. КАВАЛЁЎ.**

СТАЎКА БОЛЬШЭВІКА

Сонца пякло. Здзіўляючы па прыгожасці від адкрываўся з узгорка. Грады ўзвышшаў і падзяў нагадвалі мёртвую зыб нейкага казачнага мора, якое раптоўна акамянела, а ля самага гарызонта, зацягнутая бэзавай дымкай, як зварожаная, раскінулася красуня Узбекістана — Ферганская даліна. На Паўночным Усходзе, як вартавыя вечнасці, застылі ў халоднай, перпаздаванай красе блакітныя сілуэты горных хрыбтоў.

Чацвёра коннікаў у форме войск АДПУ па знаку аднаго, як відаць іх начальніка, спынілі коней. Коні, цяжка дыхаючы, нервова махалі хвастамі, узрывалі. Людзі маўкліва выціралі пот з загарэлых твараў.

— Маргайтэс! Далей паедзем укразіх. Вы, таварышы, вартайцеся да атрада.

— Тав. начальнік... — адзін з коннікаў рэзка павярнуўся да адваўшага загад, але, сустрэўшы спакойны, пільны погляд камандзіра, адразу асекся і амаль шэптам адказаў:

— Ёсць, да атрада.

— Ну... — начальнік чацверкі зрабіў паузу, — на ўсякі выпадак, да пабачання, таварышы. Паехалі, Маргайтэс. — І даў шпоры каню. За ім кінуўся другі чэкіст.

Два байцы хвіліну глядзелі ім услед, потым павольна павярнулі коней і, стараючыся не глядзець адзін на аднаго, рушыліся ў адваротным напрамку.

. . . . . .

— Здесьца прыехалі? Ля гэтых двух арэхавых дрэў сустрэчу мы назначылі?— Маргайтэс упэўнена кіўнуў галавой. Камандзір злез з каня, агледзеў яго потную шыю, азірнуўся навакол. — Як паліць сонца. А небз якое сіняе... Нібы памытае. Можа быць... апошні раз глядзім на яго. А?.. — Раздумлівая ўсмешка прапаўзла па твару чэкіста і знікла. Ён на імгненне шчыльна заплюшчыў вочы і адразу-ж расплюшчыў іх. Так робяць людзі, жадаючы пазбавіцца ад палакучлівай мысці. Секунду памаўчаўшы, ён паправіў рамень і адлёгнуў звычным, завучаным жэстам, гімнасцёрку.

— Штосьці наш курбашы*) спазняецца. Нібы ў адказ на яго словы з падзяў да арэхавых дрэваў, не спяшаючы, крокам пад'язджала некалькі грамоадскіх постацей у каляровых халатах, з чорна бронзавымі тварамі і імяна паблескваючымі варанёнымі маузерамі, заткнутымі за шырокія, шоўкавыя паясы.

Яны марудна і аспярожна, з зацяжкай, з усіх бакоў падступалі да прыехаўшых. Не зварачваючы на іх увагі, чэкісты адпускалі падпругі ў коней.

— Запытай, хто з'явіўся, — гучна і спакойна сказаў начальнік.

— Начальнік ДПУ з Ташкента пытае — хто з'явіўся?.. па-узбекску, а потым па-кіргізску перавёў басмачам пытанне Маргайтэс.

— Курбашы... курбашы... курбашы.

...Імёны звярэй у чалавечым вобразе, імёны, якімі маці ў даліне палохалі сваіх непаслухмяных дзяцей, прагучалі ў непарушным паветры.

— А дзе?..

Начальнік назваў самае жудаснае імя. Маргайтэс пераклаў.

— Курбашы... з'явіўся. — У расшытым шоўкавым халаце і асляпляльна белай чалме, на добрым вараным жарабцы з-за каменняў, за спіною чэкістаў вырасла постаць конніка з тонкімі точанымі рысамі твару. Не узбекскі твар.

— Няхай пад'едуць бліжэй.

Бандыты кранулі коней. Коні зрабілі некалькі крокаў, акружаючы чэкістаў.

— Перакладзі ім, — начальнік поглядзім абазу басмачоў, — перакладзі, што я начальнік ДПУ з Ташкента, прапаную ім, разам з іх бандамі здацца. Я маю дастаткова войск, каб іх знішчыць, але совецкая ўлада ніколі не праліваала крыві там, дзе можна абыйсціся без кровапраліцця...

Маргайтэс пераклаў. Бандыты сурова маўчалі. Раптам басмач у чалме зарагатаў, паказваючы два рады трапезніцка паблескваючых залатых зубоў.

— Перадай начальніку ДПУ, што курбашы... не здасцца.

Твары бандытаў ашчаліліся ўхмылкамі. Маргайтэс пераклаў словы главара. Твар чэкіста нічым не адлюстраваў яго пачуццяў. Замкнуты і каменна-спакойны, ён нагадваў маску. Толькі ў шэрых вачах бліснуў агеньчык і адразу пагас. Спакойным поглядам ён абвёў бандытаў і пад гэтым поглядам спаўзалі з твараў ухмылкі і апускаліся вочы.

Чэкіст, назваўшы сябе начальнікам ДПУ, з абыякавым поглядам прысеў на камень і закурыў, перадаўшы паводдзі каня Маргайтэсу. Па ўзвышшах і падзях буйной рыссю, узнімаючы доўга не асядаючы жоўта-белы пыл, паскакалі групы коннікаў.

Яны накіраваліся да двух арэхавых дрэў. Іх было многа. Яны заязджалі на выпаленую сонцам пляцоўку і накаплваліся кроках у 30 ад прыехаўшых. Спыніўшы коней, бандыты з цікавасцю і амаль са страхам разглядалі двух чалавек у чэкісцкай форме. Іх асаблівую ўвагу прыцягваў сядзячы на каменю чэкіст, на пятліцах якога чырванела па тры кропелькі бліскучых ромбаў. Басмачоў станавілася ўсё больш. У засаленых, брудных і абарваных халатах і выцветшых шобецейках, арнаментанымі кулямётнымі лентамі, з новенькімі англійскімі вінчэстэрамі і зінтоўкамі, на рознамасных, нізкарослых конях яны таўпіліся, не набліжаючыся да чэкістаў.

Дакурыўшы папіросу і не спяшаючыся растаптаўшы яе ботам, чалавек у форме ЧК падышоў да свайго каня, падцягнуў падпругі, лёгка ўскочыў у сядло і паехаў прама да натоўпу. Яго падарожнік зрабіў тое-ж.

Яны ведалі: ёсць два выхады—іх або схопяць, і пасля зверскіх катаванняў заб'юць, або...

Двое пад'ехалі ўпрытыльную да банды. Перад імі падпяліліся.

— Акружыць мяне, — патрабаваў начальнік.

Калі гэта фраза была перакладзена, на імгненне ўстанавілася мёртвая цішыня. Толькі коні пахрапвалі, стукаючы капытамі і лязгаючы металічным наборам агалоўя. Людзі затаілі дыханне. Курбашы разгублена пераглянуліся між сабою. Здзіўленне, амаль жах прачытаў чэкіст на тварах бандытаў. Ніхто з іх не рушыўся з месца. Нагляды твар курбашы ў чалме перастаў ухмыляцца.

— Акружыць мяне, — паўтарыў прыехаўшы.

Праз пару хвілін ён стаяў у песным кальцы некалькіх сотень коннікаў, рознапярсных і растропаных, брудных і панурых.

Яго першы загад быў выкананы. Гэта вельмі важна.

Высокі і падцягнуты, ён спакойна ўглядаўся ў бурыя твары, на якіх бліскалі толькі бялкі вачэй, і слухаў напружанае дыханне сотень людзей і коней. Ежкі пах сумесі конскага і чалавечага поту, заражаючы горнае паветра праціўнай чыстаты, біў у нос. Чэкіст глыбока вабраў у сябе паветра, прапітанае гэтым пахам, і спакойна, нягучна сказаў:

— Я начальнік ДПУ з Ташкента. Зараз тут я адзіны законны начальнік і прадстаўнік совецкай улады, а таму загадваю...

Яго падарожнік перакладаў кожнае слова асобна. Па натоўпу прайшло нараканне, падобнае на шум ветра. Чэкіст нават брывёю не павёў. Ён прадаўжаў гаварыць так, нібы перад ім стаяла не шайка, якая ўсяляе жах у жыхароў усёй незабяжнай далины, а пазначаленыя яму людзі, для якіх яго словы з'яўляюцца законам, а патрабаванні — безумоўна абавязковымі.

Чэкіст ведаў: зарта толькі згубіць гэты тон і...

Ён павольна, металічна, паслядоўна спыняў свой погляд на тварах бандытаў і ўсё тым-жа цішім, спакойным голасам вымаўляў выразна і ясна словы, для падбору якіх быў працельна напружан кожны яго нерв, кожная клетка мазга. Гэта нечалавечае напружанне волі знешне ніяк не адбілася на гаварыўшым.

У гэтыя хвіліны ён сам быў упэўнен, што не выканаць яго патрабаванняў ніхто не пасмее. Ён не дапускаў нават для сябе мысці аб непадпарадкаванні. Ён ведаў, што побач з курбашы яго слухаюць сотні апуканых дэхкан*), якія цягнуцца сваім становішчам бандытаў, рукі якіх

цягнуцца да плуга, да зямлі, у вачах якіх нарэдзяецца цяжкі смутак, калі яны з гор глядзяць на прыгожыя каўры бавоўняных плантацый і вінаградніка ў даліне.

І ён гаварыў.

Ён гаварыў, укладваючы ў простыя, лаканічныя, ціха вымаўляемыя словы ўвесь велізарны запал, перакананні большэвіка, веру ў сваю правату, веру ў сілу большэвіцкай праўды.

Ён гаварыў бандытам у прысутнасці баяў-курбашы аб тым, што яны ашуканы гэтымі баямі і муламі, ён гаварыў аб сем'ях, якія асталіся ў кішлаках**) даліны і праклінаюць сваіх бацькоў і сыноў, ён гаварыў аб магутным ураджаі бавоўны і хлеба, які паспеў на землях, якія адданы Совецкай уладаю дэхканам, ён гаварыў ім аб іх прыгожай сонечнай краіне, ворагамі якой яны сталі.

Людзі слухалі, затаіўшы дыханне.

Што таіла, што абяцала цішыня?

Гаварыўшы мог толькі здагадвацца аб гэтым.

Курбашы ў чалме рэзка рвануў паводдзі. Конь падаўся наперад, але мускулістая загарэлая рука басмача, стаяўшага побач з курбашы, спыніла яго рух. Курбашы зірнуў на дзерскага. Сустрэліся позіркі. Нядобрае прачытаў у вачах чалавека, які некалькі мінут назад падпачальваўся яму без пярэчанняў. Закусіўшы губу, бандыт астаўся на месцы, паклаўшы руку на рукаяць маузера.

... Зараз вы ўсе, са зброяй пойдзеце за мной. У кішлаку зы здадзіце зброю. Падпарадкоўваецеся вы мне. Непарушкаў, разбоўтанасці быць не можа. Патрабую дысцыпліны і падцягнутасці. — кідаў у напружаную цішыню адрывістыя словы чэкіст, і як рэха, адразу-ж чуліся гартанныя словы перакладчыка. Курбашы ў чалме павольна цягнуў маузер з-за пояса. Сустрэліся позіркамі чэкіст і бандыт. Басмач рэзка дзёрнуў руку, але... чатыры мускулістыя рукі ахапілі яго, быццам сталёвымі абручамі, рвануллі з сядла, а бандыт, што раней стрымаў каня, вырваў з рук курбашы маузер і па-гаспадарску, не спяшаючыся, засунуў яго сабе за пояс. Не павышаючы голасу, гаварыўшы прадаўжаў:

— ...Зараз вы пастроіцеся і пойдзеце за мной. Тым з вас, ашуканым дэхканам, якія трапілі сюды, паддаўшыся зшуканству, совецкая ўлада дасць магчымасць загладзіць сваё злачынства чэсным прапай. Совецкая ўлада дала дэхканам зямлю для бавоўны і вінаграда, яна дала дэхканам ваду на іх палі. Няхай жыве совецкая ўлада! Няхай жывуць органы АДПУ!

Калі перакладчык перакладаў лозунг, чэкіст уважліва ўглядаўся ў акружаючыя твары. Людзі не сустракаліся з ім позіркамі. Яны сядзелі па-ранейшаму маўкліва, уставіўшы вочы ў трывы сваіх коней, не глядзячы адзін на аднаго. Адзін з басмачаў сваім поясам, не спяшаючыся, звязваў рукі назад курбашы ў чалме ў той час, як другі ранейшаму моцна трымаў свайго... былога главара. Але і гэтыя людзі не глядзелі на таго, хто стаяў у сярэдзіне круга.

Рашалася... Рашалася ў гэту хвіліну правільнасць разліку большэвіка. І раптам... адкульсьці ззаду, яшчэ няўпэўнена, раздалося:

— Ешасун!*)

— Ешасун!!

— Ешасун!!!..—пакацілася па натоўпу.

Чэкіст дастаў хустачку і абцёр потны лоб.

. . . . . .

— Станавіся па чатыры!—Каманда прагучала звонка, радасна. Пасля яе перакладу, згрупаваючыся і блытаючыся, няўмела строіліся коннікі. Калона расла.

— Направа р-раўняйся!

*) сялян.

**) вёсках.

*) Няхай жыве!

З раўнення нічога не атрымалася, але такі-сякі парадак быў устаноўлен.

— За мной! Шагам ма-арш! Перакладзі ім яшчэ гэта, калі ласка,—звярнуўся камандзір да Маргайтэса. Твар яго шырока і мякка ўсміхаўся. Маргайтэс усміхаючыся пераклаў. Калона дрогнула і... рушылася за коннікам, які ехаў наперадзе, не аглядаючыся...

. . . . . .

— Мішка, глядзі!!

Два чырвонаармейцы, прыціснуўшыся за каменнямі ўзгорка, панючога над акружаючай мясцовасцю, здзіўлена глядзелі на незвычайную карціну, якая разгарнулася ўнізе, метрах у пяцістах ад іх. Іх начальнік ехаў наперадзе, а за ім следавала калона, добрых чатыры сотні страката апранутых коннікаў на рознамасных конях.

— Тож він басмачыв вэдэ.

— Да ну!

— От тобі і ну... дасць він мэні баню, шо прыказу не сполныв. — Ускочыўшы на коней, байцы рыссю рушыліся насустрач калоне. Выехаўшы на дарогу, яны перавялі коней на крок.

— Вы адкуль!—Начальнік ва ўпор глядзеў на байцоў. Тыя пераглянуліся, патупіліся.

— Я... Вашого приказу сполныць не мог.

— Чаму?

— Покынуць Вас з басмачамы не можна було. Мы он той узгорочок зайнялы. У нас—дзві рушніцы *). Колы-б шо, далы-б підмогу, покы патроніў хватыло.—І баец зінавата паглядзеў на начальніка.

. . . . . .

Атрад чырвонаармейцаў у поўсотні чалавек размясціўся ў адным з двароў кішлака. Даўшы корм коням, некаторыя байцы ўлягліся ў цень, паклаўшы пад галовы сёдлы, другія штосьці не спяшаючыся адшуквалі ў сваіх рэчавых мяшках і, нічога не выняўшы адтуль, зноў завязвалі іх, трэція прабавалі чытаць газету, але газетныя раркі прыгалі і зліваліся ў вачах, прачытанае не даходзіла да ўсведамлення, і рука з газетай апускалася, а баец, пасядзеўшы некаторы час нерухома, з сумам аглядаўся навокал, павольна ўставаў, прахаджваўся па двару, выходзіў на вуліцу кішлака, доўга і ўважліва ўглядаўся ў дарогу, якая ўходзіла да гор, і пяжкай паходкай вяртаўся назад.

Гаварылі мала і неахвотна. Больш маўчалі.

Адзін з байцоў сядзеў прыхіліўшыся спіной да глінабітнага плота ля састаўленых у козлы вінтовак. Адкінуўшы назад галаву і закрыўшы вочы, ён вельмі ціха, мяккім барытонам спяваў:

Край бярэжка, у запінку
Дэ в'яжуцца чоўны... чоўны...

Аксамітныя гукі песні змешваліся з гучным журчаннем арыкаў **).

Адзін з ляжачых, які, здавалася, што спіць, раптам ускочыў і рашуча падышоў да камандзіра. Камандзір, раскрыўшы планшэт з картай, пэнура ўглядаўся ў знаёмыя да дробязей тапаграфічныя абрысы і нервова барабаніў пальцамі па целулоіду планшэта.

— Што ў Вас? — камандзір уважліва ўзглянуў на падышоўшага байца.

— Ужо дванаццаць гадзін як іх няма, таварыш камандзір.

— Адзінаццаць гадзін і 45 хвілін, — удакладніў камандзір, не ўзглянуўшы на гадзіннік.

— Трэба ісці ў горы, таварыш камандзір.

— Не маю права. Атрымаў загад чакаць тут,—і нервова захлопнуўшы планшэт, камандзір палез у кішэню за папіросамі.

— Усё ў Вас?

Баец зрабіў безнадзейны жэст рукой, ціха сказаў: «усё», павярнуўся праз левае плячо і пайшоў на ранейшае месца.

*) вінтоўкі.

**) канавы, напоўненыя вадой, ідучай з гор.

Час ад часу людзі паглядалі на сонца, якое няўмольна паліла і, таксама няўмольна перазаліўшы зеніт, пачынала зараз спускацца да паўночна-заходняга краю гарызонта. Байцы чакалі. Чакалі напружана, без упэўненасці, што дачакаюцца.

— Таварыш камандзір... вартавы, хадзіўшы з вінтоўкай пад мышкай па вуліцы насупроць двара, дзе размясціўся атрад, заглянуў у двор. Яго нягучны воклич маланкападобна ўзняў людзей. Як па трывозе ўсе ўскочылі і кінуліся да выхаду на раскалёную, пыльную вуліцу.

— Аддзяленне Есюціна астацца ля зброі!—крыкнуў камандзір. Некалькі чалавек без вялікага жадання вярнулася да козлаў.

Перад вачамі байцоў стала такая карціна: з-за ўзгорка, размешчанага ў канцы кішлака, на дарозе паказалася калона басмачоў, на чале якой... спакойна ехалі чэкіст з трыма рombамі і Маргайтэс.

Уздых аблягчэння і радасці вырваўся мімавольна. Байцы кінуліся насустрач людзям, вядучым калону, якіх яны мучыцельна чакалі дванаццаць бясконца доўгіх, стамляючых гадзін. Не ўтойваючы захаплення, байцы радасна падбягалі да чэкістаў, ішлі побач з імі, з цікавасцю аглядаліся на едучых следам басмачоў.

Адзін чырвонаармеец, які апошнім выскачыў са двара, так і астаўся стаяць, пакуль калона не спынілася на вуліцы.

— Вось гэта так...—толькі і мог вымавіць ён.

Колькі велізарнай, чалавечай радасці, гонару за сваіх таварышоў, за свайго камандзіра было ім укладзена ў гэтыя тры кароткія словы!

. . . . . .

Басмачы спешыліся.

— Зброю скласці тут,—чэкіст топнуў наском бота.

Нерашуча падыходзілі басмачы і складалі ля яго ног вінтоўкі, парабелумы, маузеры. І калі зброя, велізарная куча зброі, падобная на абломкі нейкай страшэннай машыны смерці, ужо ляжала ля ног гэтага спакойнага чалавека, з крапавымі пяцілцамі і бледным тварам,—людзі, толькі што паклаўшыя зброю, выпрамляліся, быццам страхнулі з плячэй велізарны цяжар. Толькі тады яны адважваліся з-пад ілба ўзглянуць у шэрыя вочы чэкіста і, вінавата ўсміхаючыся, адыходзілі. Чэкіст уздыхнуў поўнымі грудзьмі.

— Ну, усё, Маргайтэс.—Ён зняў шапку, устрахнуў галавой, паправіў нышныя валасы і паглядзеў на пямнеючае неба. Маргайтэс здзіўлена глядзеў на галаву таварыша.

— Ты што ўставіўся?

— Барыс...—Маргайтэс ткнуў пальцам у валасы начальніка, той нават папяціўся.—Барыс, у цябе тут сівыя зусім валасы.

— Ну... Хапя... што-ж? Магчыма.—Чэкіст усміхаўся.—Здараецца, друг.

Абодва яны заражальна, весела рассмяяліся.

. . . . . .

Так была ліквідавана банда курбашы Тюракула.

Бачачы безнадзейнасць барацьбы, другія басмацкія банды пачалі таксама здавацца. Праз некалькі дзён па дарогах пацягнуліся чырвоныя абозы з хлебам і бавоўнай. Іх вялі людзі, якіх прывёў з гор чэкіст.

***

Чэкістам, які сядзіў да басмачоў, быў Барыс Давідавіч Берман,—зараз нарком унутраных спраў БССР, кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета ад Полацкай выбарчай акругі.

Ів. ШАПАВАЛАЎ.

МАЗЫРСКАЯ СЕЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА

КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ СОВЕТА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

Аляксей Васільевіч ЕРМАК

У канцы лета гэтага года знатны стахановец менскага завода імя Кірава Аляксей Ермак, атрымаўшы водпуск, наведаў сваю родную вёску Каменка на Уздзеншчыне. Нямала год прайшло з таго часу, як ён быў тут апошні раз. І хоць на вёсцы ўжо амаль не было нікога з родных, усё-ж цягнулі знаёмыя месцы, з якімі звязана нямала ўспамінаў пра першыя два дзесяткі год свайго жыцця.

Аляксей абыходзіў вёску, заглядваў ва ўсе куткі буйнай арцельнай гаспадаркі, і радасныя, прыўзнятыя пачуцці акрылялі яго. Якім непазнавальным стала аблічча вёскі і жыццё яе жыхароў! Колькі цікавай, свежай навізны ўзнікла за гэтыя годы! Прасторныя аборы і канюшні, свірны і падсобныя будынкі, школа і новыя хаты калгаснікаў надалі новы выгляд вёсцы. Здавалася, што нават і старыя, падрамантаваныя хаты ласкава і весела пазіралі сваімі вокнамі, завешанымі празрыстымі фіранкамі, з кветкамі на падаконніках.

Ля калгаснага свірна Аляксей застаў полную вераніпу падвод, гружаных мяшкамі са збожжам. У гэты дзень калгаснікі развозілі атрыманае авансам на працадні жыта і ярыну. Радасна і ажыўлена было ля свірна. У разліковай ведамасці кладаўшчыка сярэдняя лічба адвезенага да хаты збожжа на адну сям'ю дасягала 100—120 пудоў.

— І на ежу, і на вопратку. І на падсвінка—на ўсё хопіць.—гаварыў сівенькі дзядок, ад'язджаючы на падводзе ад свірна.

У гутарках з суседзямі Аляксей заўважваў бадзёры, упэўнены настрой і шчырыя клопаты аб грамадскіх, калгасных справах. Было ясна відаць, што людзі цвёрда ступілі на шлях калектыўнай гаспадаркі, і гэты шлях цалкам апраўдаў іх надзеі.

— Вось яно, заможнае жыццё, аб якім

спрадвеку марыла вясковая беднота, аб якім марыў мой бацька,—думаў Аляксей, выязджаючы з калгаса.

Ад гэтых думак, ад усяго бачанага ўзнікала ўсхваляваная радасць і безмерная гордасць за радзіму сацыялізма. Аляксей мімаволі ўспамінаў бацьку, які выбіваўся з сіл на трох дзесяцінах зямлі, спрадвеку марыла вясковая беднота, аб якім марыў мой бацька,—думаў Аляксей, выязджаючы з калгаса.

Ад гэтых думак, ад усяго бачанага ўзнікала ўсхваляваная радасць і безмерная гордасць за радзіму сацыялізма. Аляксей мімаволі ўспамінаў бацьку, які выбіваўся з сіл на трох дзесяцінах зямлі, цярпеў гора і нястачу; ён так і не дажыў да светлых дзён, памершы за тры годы да рэволюцыі. З дзецьмі засталася маці. Дзеці пасвілі летам чужых кароў, маці батрачыла на кулацкіх землях. Шэрыя, поўгалодныя годы запомніліся Аляксею. Запомніўся яшчэ час грамадзянскай вайны, жудасная белапольская акупацыя, лютыя грабяжы і расправы легіянераў над жыхарамі вёскі.

Маці памерла праз некалькі год пасля сканчэння грамадзянскай вайны. Семнаццацігадовы Аляксей лічыў сябе ўжо дарослым. Дужы, звыклы да фізічнай працы, ён ужо мог пракарміць сябе ўласнымі рукамі. У 1924 годзе ён пайшоў на лесарасцрацоўкі; у гэтым-жа годзе стаў комсамольцам. Лесарубам працаваў чатыры годы — да самага прызыву ў Чырвоную Армію.

Хмурым асеннім днём 1928 года таварышы па рабоце і вясковая моладзь урачыста праводзілі маладога прызыўніка. З гэтага часу па-новаму разгортваецца жыццёвы шлях Аляксея. Можна смела сказаць, што выдатная школа, якою была для Аляксея Чырвоная Армія, вызначыла яго светапогляд і характар, выхавала з вясковага хлопца адданага будаўніка сацыялізма, цвёрда ўпэўненага ў сваім сучасным і будучым. За два годы службы ў Чырвонай Арміі Аляксей не меў ніводнага спагнання, ніводнай заўвагі. Камандванне часці не раз ставіла яго ў прыклад іншым, і ён атрымліваў падзякі за ўзорнае выкананне загадаў і даручэнняў.

Як найбольш яркі і цікавы эпізод з свайго чырвонаармейскага жыцця, Аляксей успамінае сустрэчу любімага наркома таварыша Варашылава з байцамі. Гэта было на вялікіх асенніх манёўрах. Скончыўшы школу Аляксей быў тады малодшым камандзірам сапёрнага падраздзялення. Напружаная баявая абстаноўка, складаныя пераходы, вырашэнне замыславатых баявых задач, — усё гэта было новым і цікавым для маладога камандзіра. Аднаго дня, калі сапёрнае падраздзяленне было занята наводкай маста пераз раку, байцоў раптам абляцела вестка:

— Сёння на пераправе будзе нарком...

— Таварыш Варашылаў прыязджае...

Дзень быў па-баявому напружаны. У далечы грымела гарматная кананада. Сапёрам было загадана неадкладна навесці мост для пераправы падмацавання на ступаючым часцям. У самым пачатку работы байцы ўбачылі вынырнуўшыя з-за ўзгорка машыны. Таварыш Варашылаў, абкружаны камандзірамі, падышоў да месца работ і, выслухаўшы рапарт камандзіра падраздзялення, спыніўся, назіраючы за наводкай маста. Аляксей аблізку бачыў такі знаёмы па партрэтах твар славутага чырвонага палкаводца, прыкметную сівізну на яго вісках і ясны сканцэнтраваны позірк.

Сапёры, як і заўсёды, працавалі хутка і чотка. Праз некалькі хвілін мост быў наведзены. Таварыш Варашылаў гутарыў з байцамі. У абыходжанні ён быў простым і ветлівым, цікавіўся шматлікімі дэталямі жыцця і баявой вучобы байцоў. Недарма прысутныя пры гэтым афіцэры з замежных ваенных дэлегацый дзівіліся гэтай надзвычайнай сувязі і дружбе камандзіраў і байцоў Чырвонай Армії. Для іх, прадстаўнікоў варожага свету, было незразумелым, што чырвоныя байцы і камандзіры—гэта сыны аднаго класа, з'яднаныя адной думкай, адданыя адной справе—абароне мірнага сацыялістычнага будаўніцтва.

Ад'язджаючы, таварыш Варашылаў вынес падзяку сапёрнаму падраздзяленню.

Дысцыплінаванасць, любоў да працы, звыкласць да чоткага выканання даручэнняў прывёз з сабой Аляксей з Чырвонай Арміі на завод, куды паступіў чорнарабочым пасля дэмабілізацыі. У 1930 годзе пяперашні станкабудаўнічы завод імя Кірава толькі пачынаў адбудоўвацца. Першая сталінская пяцігодка паставіла перад рабочым калектывам задачу асвоіць вытворчасць складаных станкоў.

Майстар механічнага цэха адразу звярнуў увагу на дапытлівага маладога рабочага. Падносячы дэталі, Аляксей прыглядваўся да работы на радыяльным станку, распытваў пра яго, заставаўся пасля работы, уважліва чысціў і адначасова вывучаў дэталі станка. Марай Аляксея было—стаць кваліфікаваным рабочым.

— Пры тваёй дапытлівасці ты хутка авалодаеш гэтым станком, — гаварыў яму майстар.

Мара збылася неўзабаве. З дапамогаю майстра і кваліфікаваных рабочых, пры вялікай старанасці, Аляксей стаў выдатным токарам. Самыя складаныя дэталі выходзілі з-пад яго рук без браку. З былога чорнарабочага вырастаў ударнік стаханавец. Вечарамі ён наведваў тэхнічныя гурткі, чытаў тэхнічную літаратуру, нястомна павышаў сваю кваліфікацыю. Яго вылучылі кіраўніком брыгады па зборцы станкоў. У агульназаводскім спаборніцтве брыгада Ермака атрымала пярэшнства. Лічба выканання промфінплана ўзрастала да 200 проц. і вышэй.

Яго брыгадзе даручалі найбольш адказныя і складаныя работы. Калі завод атрымаў заданне асвоіць вытворчасць пілы Гелера, алмінісцрацыя ўскладала гэтую работу на брыгаду т. Ермака.

— Аляксей са сваімі хлопцамі здолее асвоіць гэтую складаную штуку,—упэўнена сказаў парторг цэха дырэктару завода.

— Не думаю, каб ён спасаваў,— згадзіўся дырэктар.

Піла Гелера, прызначаная для разрэзкі халоднага металу, увозілася тады з-за граніцы. Яна ўяўляла сабою сапраўды вельмі складаны механізм. Патрэбна было разабрацца ў замыславатых чарцяжах, падрыхтаваць станкі і інструмент, дабіцца ў рабоце выключнай чоткасці. З усім гэтым справілася брыгада Ермака. Піла Гелера была асвоена, і пяпер за год заводам выпускаецца 120 піл.

Вельмі вырас аўтарытэт Аляксея Васільевіча на заводзе. Сваёй работай, сваім актыўным удзелам у грамадскім жыцці ён заваяваў пашану ў старых і моладзі.

У гэтым годзе Аляксея Васільевіча Ермака вылучылі на адказную дзяржаўную работу. Сесія ЦВК БССР выбрала яго выконваючым абавязкі сакратара ЦВК. Аднак гэта не адарвала яго ад жыцця завода: ён — часты госць і ў новамеханічным цэху, і ў кузні, і ў партыйным камітэце, і на сходах рабочых. Рабочы калектыў ганарыцца ім, як адным з лепшых выхаванцаў завода.

Сходы калгаснікаў Мазырскай сельскай выбарчай акругі вылучылі таварыша Ермака сваім кандыдатам у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей. Акрутовая выбарчая камісія зарэгістравала яго кандыдатуру.

Гэтая вестка надзвычайна ўсхвалявала і ўзрадвала Аляксея Васільевіча. Адразу-ж пасля атрымання паведамлення выбарчай камісіі ён напісаў сваім выбаршчыкам цёплае пісьмо, прасякнутае пачуццём удзячнасці і гарачым жаданнем апраўдаць аказанае яму давер'е. Неўзабаве прыехаў ён і сам на Мазыршчыну. Выбаршчыкі з палескіх калгасаў убачылі маладога дзяржаўнага дзеяча, вышаўшага з гушчы працоўнага народа, поўнага энтузіязма, простага, ветлівага.

— Я горды вашым давер'ем,—гаварыў ён на мітынгах і сходах выбаршчыкаў.— Прыкладу ўсе сілы, усю энергію, каб заўсёды на любым даручаным мне ўчастку быць ластойным сынам радзімы сацыялізма.

Тар. ХАДКЕВІЧ.

НАШАМУ ДЭПУТАТУ

Словы Янкі Купалы *Музыка С. Палонскага*



І песні, і музыка, й людзі гамоняць
Ад фабрык да фабрык, ад хат і да хат.
Народ беларускі шчаслівы сягоння:
Клімент Варашылаў яго дэпутат!

Народ усім сэрцам, як роднага брата,
Шануе і любіць яго па над свет.
І сэрца аддасць за свайго дэпутата,
Пасла-дэпутата ў Вярхоўны Совет.

У нашым Совецкім Саюзе не мала,
Хто нам пазайздросціць, — вось так, — з дабраты. —
Дык ведайце: маршал даўно ўжо і стала
Любіў Беларусь нашу й любіць, браты!

Калі ён, бывала, да нас на манеўры
Прыедзе агледзець кашы, рубяжы.
О колькі той радасці, колькі той веры,
Што вораг не пройдзе ўжо нашай мяжы!

Паважна старыя вітаюць наркома, —
Падносяць хлеб-соль, каравай і мёд,
І кветкі-вяночкі — дзяўчаты, вядома, —
Падносяць яму на шчаслівы прыход.

Народ беларускі пазбыўся сатрапаў,
Палі свае сее спакойна штогод.
Не страшны яму дэфензівы, гестапы,
Ні панская Польшча, ні гітлераў зброд.

Наш слесар-луганскі, Нарком абароны
Засядзе ў Вярхоўным Совеце ад нас.
Краса нашай Арміі слаўнай Чырвонай,
Мы пойдзем з табою ў паходы не раз!

Бо час як надыйдзе і гром бітвы ўдзяра,
І трубы затрубяць, паклічуць у бой, —
Супроць банд фашысцкіх, пагромаў, пажараў
Народ беларускі паўстане з табой.

І песні, і музыка, й людзі гамоняць
Ад фабрык да фабрык, ад хат і да хат.
Народ беларускі шчаслівы сягоння:
Клімент Варашылаў яго дэпутат!

А сонейка будзе усходзіць, заходзіць,
Плысці будуць рэчкі, шумець будзе бор,
Жыць будзе ў свабодным шчаслівым народзе
Імя палкаводца ад зораў да зор.

МАСАВАЕ ВЫДАННЕ БІЯГРАФІІ тав. К. Е. ВАРАШЫЛАВА

Партвыдат ЦК КП(б)Б гэтымі днямі выдае масавым тыражом на літаграфскай паперы вялікага размеру плакат з біяграфіяй і партрэтам кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР ад Менскай гарадской выбарчай акругі — наркома абароны маршала Совецкага Саюза тав. Клімента Ефрэмавіча Варашылава. Плакат будзе вывешан на выбарчых участках, на прадпрыемствах, за ўстановах, грамадскіх арганізацыях.

ЗВЫШ 100 ТЫСЯЧ ЧАЛАВЕК НАВЕДАЛІ ВЫСТАЎКУ „БССР ЗА 20 ГОД“

Усебеларуская выстаўка «БССР за 20 год» карыстаецца велізарным поспехам. За час існавання выстаўкі ў Доме ўрада і Доме Чырвонай Арміі яе наведала звыш 100 тысяч чалавек.

Кожны дзень у сярэднім выстаўку наведвае звыш 20 экскурсій рабочых, служачых, чырвонаармейцаў, школьнікаў. Выбарчыя ўчасткі г. Менска арганізуюць шмат экскурсій, у якія ўвахозіць пераважна неарганізаванае насельніцтва — хатнія гаспадыні і інш.

На выстаўку прыязджаюць экскурсіі з раёнаў БССР. Ужо наведалі выстаўку члены арцеляў бабруйскага шкіпромсаюза, вучні станкаўскай калгаснай школы, Менскага раёна, пухавіцкай сярэняй школы, а таксама калгаснікі Менскага раёна.

Наведвальнікі выстаўкі «БССР за 20 год» у кнігах возлываў пакідаюць свае ўражанні аб выстаўцы. Кожны запіс у кнізе—гэта вялікая падзяка за перамогі, рост і росквіт Совецкай Беларусі, якія дасягнуты пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, ізякуючы вялікім бацькоўскім клопатам аб беларускім народзе любімага Сталіна.

АДНАДЗЕННЫЯ ЯСЛІ НА ВЫБАРЧЫХ УЧАСТКАХ

Наркамат аховы здароўя БССР праводзіць рад мерапрыемстваў па абслугоўванню выбаршчыкаў.

Па рэспубліцы на кожным выбарчым участку абсталёўваюцца аднадзенныя дзіцячыя яслі, якія будуць працаваць 12-га снежня ў дзве змены.

Усе стацыянарныя дзіцячыя яслі таксама будуць працаваць на дзве змены. Праводзіцца ўлік выбаршчыц, якія маюць малых дзяцей.

НАДРУКАВАНА 7 МІЛЬЁНАЎ ВЫБАРЧЫХ БЮЛЕТЭНЯЎ

Друкарні Гомеля, Віцебска і Магілева выканалі заданне па друкаванню выбарчых дакументаў для выбарчых акруг БССР. Праз 1—2 дні заканчвае друкаванне апошні партыі бюлетэняў менская друкарня імя Сталіна. Усяго надрукавана бюлетэняў па выбарах у Совет Саюза і Совет Нацыянальнасцей каля 7 мільёнаў экземпляраў.

УСТАНАВІЛАСЯ САННАЯ ДАРОГА

У раёнах рэспублікі снег ляжыць няроўнамерна. Найбольш яго выпала ў Горацкім раёне — 20 см. На крайнім паўднёвым усходзе (Камарын, Брагін, Хойнікі, Нароўля, Лоеў) — снегавы пакроў ад 2 да 5 см.

Тэмпература размяркоўваецца таксама няроўнамерна. На поўначы рэспублікі (Полацк) 2 снежня было 13 градусаў мароза, а ў Слуцку і Лельчыцах — адліга.

У большасці раёнаў устанавілася санная дарога.

ПРАВАКАЦЫЙНАЯ ВЫХАДКА ПОЛЬСКАЙ ВАЕНШЧЫНЫ

ШЭПЕТОЎКА, 2 снежня. (БЕЛТА). Вечарам 29 лістапада на польскай станцыі Здалбунова совецкі поезд № 34/2951, які вяртаўся з Польшчы ў СССР, нечакана быў адчэплен канвоем. У ацапленні ўдзельнічала шмат падазроных асоб з ваеннай выпраўкай, але, відавочна, наспех перанапранутых у грамадзянскае адзенне.

Калі звычайна напа паязная брыгада, аформіўшы дакументы, свабодна займала свае месцы ў вагонах поезда, то на гэты раз усе нашы работнікі былі падвергнуты зняважліваму асабістаму вобыску аж да раздзявання і прыдзірчывага агляду абутку. Распаясаўшыяся ў сваёй нагласці чыны польскай паліцыі і афіцэры рабілі вобыск, пагражаючы зброяй. Спрабаваўшы супраціўляцца змазчык тав. **Хінчук** быў збіт.

І ўсё-ж, пасля такой гісторыі з вобыскам, польскім уладам станцыі Здалбунова чамусьці спатрэбілася прымусіць усю паязную брыгаду сканцэнтравацца пад канвоем у адным вагоне, пазбавіўшы кандуктара хваставога вагона магчымасці сачыць за безапаснасцю следвання поезда. У дадатак да ўсяго гэтага аказалася чамусьці патушаным электрычнае асвятленне ва ўсіх класных вагонах.

Як высветлілася праз некаторы час, усё гэта было толькі ўступленнем да падзей яшчэ большай нагласці.

На пералапошняй да совецкай граніцы станцыі Магіляны наш машыніст т. Саўюк, перад самым адпраўленнем поезда заўважыў пры святле сігнальнага агню, як мясцовы польскі стрэлачнік спяшаючыся падбег да класнага вагона і перадаў туды якісьці бідон.

Перад падыходам да совецкай граніцы «нечакана» ўзнік пажар у мяккім вагоне № 201. Тав. Саўюк падняў трывогу, спрабуючы прыняць меры да тушэння пажару. Выскачыўшыя з поезда польскія агенты ў штацкім адзенні і ваеннай форме пагрозамі і крыкамі прабавалі прымусіць машыніста следаваць з гарэўчым саставам на совецкую тэрыторыю. Тав. Саўюк, не гледзячы на пагрозы, самааддана адчапіў гарэўчы вагон ад астатняга саставу.

Правакацыйныя паводзіны польскай ваеншчыны прадаўжаліся і на наступны дзень, калі, згодна вузлавога польска-совецкага пагаднення, у Магіляны для расследвання на месца здарэння прыбылі прадстаўнікі паўднёва-заходняй чыгункі ў асобе начальніка шэпетоўскага аддзялення службы руху тав. **Чэрнего** і начальніка вагоннага ўчастка тав. **Вароніна**.

Замест выражэння жалю па поваду адбыўшагася, замест самай элементарнай ветлівасці — польскія афіцэры забаранілі совецкім чыгуначнікам карыстацца сваім службовым вагонам, як гэта звычайна мела месца, памясціўшы іх у памяшканне пагранпаста і прыставіўшы канваіраў для суправаджэння пры кожным выхадзе з паста. Больш таго, у 4 гадзіны ночы 1 снежня, пасля высвятлення акалічнасцей пажару, польскія афіцэры прапанавалі было совецкай дэлегацыі пехатою ўдаліцца з польскай тэрыторыі. Вядома, нашы чыгуначнікі з абурэннем адверглі гэту прапанову, але да 6 гадзін раніцы вымушаны былі знаходзіцца на польскім пагранічным пасту.

Характэрна, што совецкім дэлегатам было адмоўлена ў выдачы ўсяго матэрыялу расследвання, а ўручан толькі наспех састрапаны агульны пратакол, дзе польскія ўлады прабуюць узваліць віну за падпал поезда на паязную брыгаду, якая, у парушэнне ўстанавіўшагася парадку, імі-ж была пазбаўлена магчымасці сачыць нават за безапаснасцю следвання поезда, будучы ізаляванай пад канвоем у адным вагоне.

Совецкая дэлегацыя, на аснове прыведзеных фактаў, адзначыла ў складзеным ёю пратаколе ўсе правакацыйныя выхадкі польскай ваеншчыны і ўсклала адказнасць за пажар і страты на польскую старану.

Заўвага ТАСС: Як ТАСС паведаўся з паінфармаваных крыніц, паўпрэдстаў СССР у Варшаве даручана, у сувязі з правакацыйнай выхадкай у Здалбунове, заявіць пратэст, патрабаваць расследвання, пакарання вінаўных і пакрыцця страт.

АБУРАНЫ НАГЛАЮ ПРАВАКАЦЫЯЙ

ЛАГОЙСК, 3 снежня. **(Перададзена па тэлефону).** Паведамленне аб наглай правакацыйнай вылазцы польскай ваеншчыны, якая напала на совецкі поезд і зізеквалася над совецкімі грамадзянамі, выклікала вялікае абурэнне прапоўных Лагойскага раёна. У Лагойску адбыўся шматлюдны мітынг. У рэзалюцыі, прынятай мітынгам, гаворыцца:

— Мы, прапоўныя Лагойска, абураны наглаю вылазкай польскай ваеншчыны, якая, па ўказцы фашысцкай Германіі, імкнецца справаказаць вайну.

Мы адналушна заяўляем, што ніякія правакацыі падпальшчыкаў вайны нам не страшны. Совецкі народ няўхільна правотзіць палітыку міру, мірна будуе сацыялістычнае грамадства. Мы не баімся пагроз і ў любы час гатовы даць такі знішчальны адпор фашысцкім гадам, каб яны больш не поўзалі па зямлі. Хай добра запамятаюць гэта польскія паны!

У адказ на наглую вылазку польскіх фашыстаў, мы будзем яшчэ больш мацаваць абароназдольнасць Краіны Советаў, павысім сваю рэволюцыйную пільнасць, знішчым усіх да аднаго япона-германскіх і польскіх шпіёнаў і дыверсантаў, трапкісцка-бухарынскую поскудзь. Будзем дзейна дапамагаць нашым слаўным чэкістам ахоўваць свяшчэнныя совецкія граніцы.

Просім Совецкі ўрад прыняць меры да тэрміновага расследвання злачынства польскай ваеншчыны і прыпягнення вінаватых да суровай адказнасці.

Запэўняем партыю, Совецкі ўрад і асабіста правадыра народаў таварыша Сталіна, што працоўныя Лагойскага раёна гатовы па першаму закліку стаць са зброяй у руках на абарону сваёй социялістычнай радзімы.

Н. ДУБІЦКІ.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

Згодна паведамлення іспанскага міністэрства абароны ад 2 снежня, рэспубліканскія войскі ў сектары Гвадалахары (на паўночны ўсход ад Мадрыда) энергічна адбілі атаку мяцежнікаў. Мяцежнікі панеслі пры гэтым цяжкія страты.

УСХОДНІ (арагонскі) ФРОНТ

Рэспубліканскія войскі занялі невялікае ўзвышша ў сектары Эбро і палепшылі свае пазіцыі. Рэспубліканская артылерыя рассеяла скапленні войск мяцежнікаў каля Орна.

У раёне Ніжняй Арагоніі рэспубліканскія войскі адбілі атаку мяцежнікаў.

Па паведамленню агенцтва Эспань, у сувязі з нядаўняй бамбардыроўкай ваенных аб'ектаў горада Сабіньяніго рэспубліканскай авіяцыяй прычынены сур'ёзныя пашкоджанні электрычнай станцыі. На працягу апошніх двух дзён Сабіньяніго пагружан у цемру.

***

На паўднёвым фронце без перамен.

(БЕЛТА).

Памяці Ганса Беймлера

ПАРЫЖ, 3 снежня. (БЕЛТА). У сувязі з гадавінай з дня гераічнай смерці члена ЦК германскай компартыі, палітычнага камісара інтэрнацыянальнай брыгады Ганса Беймлера, загінуўшага 1 снежня 1936 года на мадрыдскім фронце, у Мадрыдзе адбыўся жалобны сход, на якім прысутнічалі прадстаўнікі ўсіх партый і арганізацый народнага фронта, а таксама генерал Міяха. У выступленнях шматлікіх аратараў падкрэслівалася роля інтэрнацыянальнай брыгады і Ганса Беймлера ў барацьбе за незалежнасць Іспанскай рэспублікі. Прамоўцы выказалі ўпэўненасць у канчатковай перамозе рэспубліканскай арміі.

Японская правакацыя на тэрыторыі міжнароднага сетльмента ў Шанхаі

ТОКІО, 3 снежня. (БЕЛТА). Сёння ў Шанхаі на тэрыторыі французскай канцэсіі і міжнароднага сетльмента (кварталы) японскае камандаванне наладзіла ваенны парад. Як паведамляе агенцтва Домей Цусін, у часе праходжання калоны «нейкая асоба з даху аднаго будынка кінула дзве ручныя гранаты. Паранены тры чалавекі. Ваенныя атрады спынілі ход і ўстанавілі ахову на ўчастках, прылягаючых да месца здарэння».

Агенты Гестапо ва Францыі

ПАРЫЖ, 2 снежня. (БЕЛТА). Газеты «Се суар» і «Эвр» прыводзяць паведамленне лонданскай газеты «Дэйлі скэтч», у якім гаворыцца, што прадстаўнікі французкай паліцыі ў суправаджэнні чыноўнікаў «Скотланд ярд» (англійская паліцыя) вялі гутаркі з кіраўнікамі адной англійскай фірмы ў Лондане. Гэта фірма ўскосна выступала ў якасці агента па закупцы зброі для французскіх змоўшчыкаў. Французскія змоўшчыкі на закупку зброі выдаткавалі 600 тыс. фунтаў стэрлінгаў (каля 90 мільёнаў франкаў). Газета «Се суар» рэзонна дадае, што гэта паведамленне не павінна паслужыць поваадам для адцягнення ўвагі, бо вядома, што зброя паступала не з Лондана.

«Се суар» лічыць, што фінансаванне выкрытай фашысцкай змовы вялося за кошт двух крыніц: першая — гэта ўзносы, якія паступалі ад розных французскіх арганізацый і некаторых асоб, і другая — паступленні з-за граніцы. У сувязі з другой крыніцай фінансавання газета спыняецца на дзейнасці неаднаразова называўшагося ў апошні час барона Потэрса, які з'яўляецца яўным агентам Гестапо. Потэрс быў песна звязан з існуючай у Берліне арганізацыяй «Фербіндунгштаб». Праз Потэрса «Фербіндунгштаб» быў звязан з арганізацыяй французскіх фашысцкіх змоўшчыкаў. Апрача таго Потэрс знаходзіўся ў песнай сувязі з небезвядомай нафтавай кампаніяй «Рояль дэтч».

«Юманітэ», патрабуючы арышту ўсіх фашысцкіх змоўшчыкаў, выкрывае песную сувязь рэнегата Дорыо з Гестапо. Газета ставіць Дорыо рад пытанняў, выкрываючых яго сувязь з германскім фашызмам.

Масавыя самагубствы ў фашысцкай Германіі

БЕРЛІН, 2 снежня. (БЕЛТА). Лік масавых самагубстваў у фашысцкай Германіі ўзрастае з кожным днём. За апошнія 2—3 дні ў адным толькі Берліне зарэгістраван рад самагубстваў з-за безвыходнага станазішча.

У Шэлеберзе (раён Берліна) атруціліся старыкі — муж і жонка. У Паўночным раёне сталіцы кінулася пад поезд маладая жанчына. У тым-жа раёне, насялёным, галоўным чынам, рабочымі, пакончыла самагубствам маці з 5-гадовай дочкай, атруціўшыся свяцільным газам. Вячэрнія газеты паведамляюць аб самагубстве жанчыны, якая кінулася з вышкі радыёвежы на берлінскай выставачнай плошчы. У Рэклінгаузене (Вестфалія) пакончылі самагубствам, кінуўшыся пад поезд, жанчына са сваім 7-гадовым сынам. (БЕЛТА).

ПАПРАЎКА

Ва ўчарашнім нумары газеты «Звязда» на чацвёртай старонцы ў заметцы «Прыгавор па справе былых кіраўнікоў Дуброўенскага раёна» па віне вярстальшчыкаў друкарні (брыгадзір т. Шляпо) дапушчана памылка. Былы дырэктар МТС Радзіві́новіч прыгавораны да пазбаўлення волі ў папраўча-працоўных лагерах тэрмінам на 20 год, а не на 5 год, як надрукавана ў газеце.

Намеснік адказнага рэдактара І. М. ОФЕНГЕЙМ.

Гукавы кінатэатр «Чырвоная зорка»
Даклад таварыша СТАЛІНА І. В. аб праекце канстытуцыі Саюза ССР на Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездзе Советаў 25 лістапада 1936 г.

Белдзярждрамтэатр
4 снежня
закрыты спектакль
Абанементы несапраўдны.

Дзіцячы гукавы кінатэатр РАДЗІМА КЛІЧА

Гукавы кінатэатр «ПРОЛЕТАРЫЙ»
ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Гукавы кінатэатр «Інтэрнацыянал»
Неустрашымыя

Гукавы кінатэатр «Спартак»
На Далёкім Усходзе

ПРЫЁМ ЗАЯЎ
НА АДНАГАДОВЫЯ КУРСЫ СЯСЦЁР АХОВЫ ЗДАРОЎЯ ДЗЯЦЕЙ І ПАДРОСТКАЎ ПРЫ ІНСТЫТУЦЕ АМД
ПРАЦЯГНУТ да 10 СНЕЖНЯ.
Умовы прыёму надрукаваны ў газеце «Звязда» ад 20 кастрычніка № 241, 10 лістапада № 258 і 22 лістапада № 268.
ДЫРЭКЦЫЯ.

ЦК САЮЗА РАБОТНІКАЎ ПАЧАТКОВАЙ І СЯРЭДНЯЯ ШКОЛЫ БССР
АРГАНІЗУЕ ВЕЧАР,
ПРЫСВЕЧАНЫ ДНЮ КАНСТЫТУЦЫІ
і падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет СССР
Вечар адбудзецца 5 СНЕЖНЯ ў 7 гадзін вечара ў памяшканні Дома асветы (Комуністычная, 19).
Уваход па білетах, якія павінны атрымаць МК у Доме асветы.

МЕНСКІ ГАРАДСКІ АДДЗЕЛ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ
даводзіць да ведама працоўных горада і Прыгараднага сельсовета, што
з 1 снежня
ўведзена перавозка рожаніц у радзільныя дамы на спецыяльна выдзеленых лімузінах М—1
пры станцыі хуткай дапамогі, тэл. № 03.
МЕНГАРЗДРАЎ.

Аддзел падпіскі Беларускага аддзялення КОГІЗ'а
АДКРЫТА ПАДПІСКА
на ЖУРНАЛЫ на 1938 год
па наступных раздзелах:
ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ
СОЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫ
ВУЧЭБНА-ПЕДАГАГІЧНЫ
СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫ
АНТЫРЭЛІГІЙНЫ
ТРАНСПАРТНЫ
ВАЕННЫ
НАВУКОВА-ТЭХНІЧНЫ
МУЗЫКАЛЬНЫ
МЕДЫЦЫНСКІ
СОВЕЦКАЕ ЗАКОНАДАЎСТВА
ФІЗКУЛЬТУРА і ТУРЫЗМ.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА:
УСІМІ РАЙАДДЗЯЛЕННЯМІ, МАГАЗІНАМІ І УПАЎНАВАЖАНЫМІ БЕЛ. АДДЗ. КОГІЗ'а, А ТАКСАМА НЕПАСРЭДНА АДДЗЕЛАМ ПАДПІСКІ КОГІЗ'а — г. Менск, Совецкая, 73 (тэл. № 23-709).
НЕ ЗАБУДЗЬЦЕ
ЗДАЦЬ ПАДПІСКУ НА ЖУРНАЛЫ ОГІЗ'а ЗАГАДЗЯ І НА БОЛЬШ ПРАЦЯЖНЫ ТЭРМІН, ШТО ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ БЕСПЕРАБОЙНАЕ ІХ АТРЫМАННЕ НА ПРАЦЯГУ УСЯГО 1938 ГОДА

ДА ВЫБАРАЎ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ СССР
ВА ЎСЕ КНІЖНЫЯ МАГАЗІНЫ І КІЕСКІ КОГІЗ'а.
ПАСТУПІЛА Ў ПРОДАЖ НАСТУПНАЯ ЛІТАРАТУРА
(на рускай мове):
1. В. СТАЛІН. Даклад аб праекце Канстытуцыі. Канстытуцыя (Асноўны закон) СССР. Партвыдат, 1937 г. Цана 30 к.
ПАЛАЖЭННЕ АБ ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ СССР. Партвыдат, 1937 г. Цана 10 к. (на рускай, беларускай і яўрэйскай мовах).
М. І. КАЛІНІН. Што дала совецкая ўлада працоўным. Партвыдат, 1937 г. Цана 15 к.
А. Я. ВЫШЫНСКІ. Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР у пытаннях і адказах. Партвыдат, 1937 г. Цана 25 к. (на рускай і беларускай мовах).
В. М. МОЛАТАЎ. Канстытуцыя социялізма. Партвыдат, 1937 г. Цана 15 к.
НАША РАДЗІМА. Партвыдат, 1937 г. Цана ў перапл. 1 р. 25 к.
А. С. СПЕКТАРАЎ. Сталінскі выбарчы закон і совецкая моладзь. «Молодая гвардия», 1937 г. Цана 45 к.
АБ КАНСТЫТУЦЫІ САЮЗА ССР. Зборнік. Партвыдат, 1937 г. Цана 50 к.
А. ПУЗІН. Выбарчы закон социялістычнай дзяржавы. Выдавецтва ЦК ВЛКСМ «Молодая гвардия». Цана 30 к.
СЛОЎНІК У ДАПАМОГУ ВЫБАРШЧЫКУ. Соцэкгіз, 1937 г. Цана 1 р. 35 кап.
СССР І КРАІНЫ КАПІТАЛІЗМА. Партвыдат, 1937 г. Цана ў перапл. 80 кап.
М. ГУБЕЛЬМАН. Работнікі совецкага гандлю. Профвыдат, 1937 г. Цана 15 кап.
Н. МІХЕЕЎ. Работнікі народнай сувязі. Профвыдат, 1937 г. Цана 15 кап.
1. МЕЖЛАУК. Падрыхтоўка да выбараў і совецкае студэнцтва. Выд-ва «Молодая гвардия», 1937 г. Цана 10 кап.
Ц. СЦЕПАНЯН. СССР — социялістычная дзяржава рабочых і сялян. «Молодая гвардия», 1937 г. Цана 20 кап.
Я. ШАПІРА. Пажарныя раней і цяпер. Профвыдат, 1937 г. Цана 30 кап.
П. НЕФЕДАЎ, В. ЗЕНІН. Дворнікі раней і цяпер. Профвыдат, 1937 г. Цана 10 кап.
Г. СЕНЮКОЎ І Л. ЦЫЛАЎ. Жыццё пекара раней і цяпер. Профвыдат, 1937 г. Цана 10 к.
П. ЕРОХІН. Мінулае і сучаснае цырульніка. Профвыдат, 1937 г. Цана 15 кап.
Н. В. ТАЛАЛАЕЎ. Совецкі міліцыянер. Профвыдат, 1937 г. Цана 20 кап.
К. МАРЦЬЯНАВА. Настаўнік у Совецкай краіне. Профвыдат, 1937 г. Цана 15 кап.
І. СТРАШУН. Совецкі ўрач. Профвыдат, 1937 г. Цана 25 к.
С. БРЭГМАН. Выбары ў Вярхоўны Совет СССР і профсаюзы. Профвыдат, 1937 г. Цана 15 к.
К. І. КІРСАНАВА. Выбарчы закон і жанчына. Соцэкгіз, 1937 г. Цана 25 кап.
С. М. БУДЗЕННЫ. Баец-грамадзянін. Партвыдат, 1937 г. Цана 15 кап.
Ф. М. ПУЦІНЦАЎ. Выбары ў Советы і выкрыццё напоўшчыны. ГАІЗ, 1937 г. Цана 55 кап.
Вл. САРАБ'ЯНАЎ. Рэлігія — опіум народа. ГАІЗ, 1937 г. Цана 20 кап.
ПЕРАЛІЧАНЫЯ КНІГІ МОЖНА НАБЫЦЬ ВА ЎСІХ КНІЖНЫХ МАГАЗІНАХ І КІЕСКАХ КОГІЗ'а.
У ВЫПАДКУ АДСУТНАСЦІ КНІГ НА МЯСЦАХ ЗАКАЗЫ НАКІРОЎВАЙЦЕ ПА АДРАСУ: г. Менск, Совецкая, 60— «Кніга-поштай».
БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ КОГІЗ'а.

УПРАЎЛЕННЕ СЯЦЕЙ І ПАДСТАНЦЫЙ Г. МЕНСКА
(Совецкая, 110),
праводзіць на прадпрыемствах г. Менска
ЗАМЕРЫ ЗАГРУЗАК МАТОРАЎ
з мэтай выяўлення прадзерна й магутнасці.
ЗАЯЎКІ ПРЫМАЮЦЦА па адрасу: Індустрыяльная вул., 7. Электрапаба раторыя (тэл. 20-060, дабавочны 48).
У заяўцы ўказваць колькасць матораў, іх магутнасць і жаданы час правядзення работ.
УПРАЎЛЕННЕ СЯЦЕЙ І ПАДСТАНЦЫЙ Г. МЕНСКА.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Менск, Совецкая, 63. ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: рэдактара — 21-352; сакратарыята — 25-128, 20-636; аддзелаў: партыйнага — 21-353, совецкага будаўніцтва і гандлю — 22-412, прамысловага — 21-356, сельскагаспадарчага — 21-846, культуры — 23-355, мясцовай і замежнай інфармацыі — 25-189, аддзела пісем — 20-844, 21-399, 21-885, ілюстрацыйнага і стыльрэдактуры — 21-356, абмеркаванняў — 21-845.

Уп. Галоўлітбела № К—3176. Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая 63. Ю., Л., Б.